# ЗА КУЛІСАМІ АДНОЙ ЗМОВЫ

## Некаторыя рассакрэчаныя дакументы пра падзеі 19 снежня

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

15 студзеня 2011 г.
СУБОТА
№ 8 (26872)
Кошт 650 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Фота БЕЛТА.



ШТУРМ Дома ўрада выклікаў абурэнне ў беларускім грамадстве. Падаплёка гэтых падзей вядомая: замежныя аналітычныя цэнтры сфарміравалі і прафінансавалі пэўныя структуры радыкальнага кірунку. Яны і паспрабавалі звергнуць законную ўладу і навязаць грамадству сваё разуменне «дэмакратыі». Цяпер гэтыя падзеі інтэрпрэтуюцца па-рознаму. Грамадскаму меркаванню навязваецца абсурд. Узмоцнена ўтлумачваецца, што на плошчу прыйшлі выключна мірна настроеныя грамадзяне, якія пажадалі ўсяго толькі «даведацца пра вынікі прайшоўшага галасавання». Гаворыцца, што ніякага арганізуючага пачатку ўвогуле не было, што ўсё адбылося выпадкова.

Тыя, хто так несумленна інтэрпрэтуе падзеі, што адбыліся, нагадваюць і пра прыезд у Мінск міністраў замежных спраў Польшчы і Германіі, іх прапановы «добра заплаціць» за «правільна праведзеныя выбары». Моцна гучаць заклікі такіх агрэсіўных палітыкаў, як фраў Бек, спадар Бузек, якія раз'юшана патрабуюць для Беларусі ўсіх неймаверных пакаранняў.

Усім вядома, што знешняя палітыка, якая праводзіцца вышэйшым кіраўніцтвам Беларусі, носіць выключна дружалюбны характар, нацэленая толькі на развіццё добрасуседскіх адносін з усімі краінамі, а ўнутраная — забяспечвае стабільнае і паступальнае развіццё беларускага грамадства. Унікальнасць і эфектыўнасць беларускай мадэлі сёння вымушаны прызнаць нават самыя ярыя апаненты ўлады як у самой Беларусі, так і за мяжой.

Аднак сам факт існавання такой незалежнай дзяржавы, якая будуе палітыку, зыходзячы са сваіх нацыянальных інтарэсаў, выклікае рэзкае раздражненне з боку некаторых знешнепалітычных сіл, што імкнуцца падпарадкаваць сваім інтарэсам яшчэ не ахопленыя ўплывам дзяржавы на постсавецкай прасторы, да якіх у цяперашніх умовах адносіцца Рэспубліка Беларусь.

Прычына такой пільнай увагі і інтарэсу замежных паліттэхнолагаў да нашай краіны відавочная.

Яна абумоўлена ў першую чаргу не праблемамі «дэмакратыі», а выключным геапалітычным значэннем нашай краіны на еўразійскай прасторы. СТАР. 2

# ЗА КУЛІСАМІ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

Імкненне некаторых знешнепалітычных сіл Захаду звысоку глядзець на Усход само па сабе не новае. Гэтае імкненне і раней праяўлялася ў даўніх «крыжовых паходах» Захаду на Усход і адносна нядаўнім «Drangen nach Osten» у часы Другой сусветнай вайны. Але часы змяніліся. Ваеннае ўварванне ў краіну з мэтай зверджэння кіруючага рэжыму ўжо не дае «станоўчага» выніку. На ўзбраенне ўзята другая стратэгія — інспіраванне кіруемых звонку ўнутрыпалітычных канфліктаў. Яскравымі прыкладамі рэалізацыі гэтай стратэгіі з'яўляюцца т.зв. «каляровыя рэвалюцыі» ў шэрагу краін постсавецкай прасторы.

Ужо не першы год робяцца спробы рэалізацыі гэтай стратэгіі і ў Беларусі.

Але, нягледзячы на дасканаласць метадаў уздзеяння і вытанчанасць інструментарыю, такога, як эканамічны ціск, запалохванне, увядзенне рознага роду санкцый і абмежаванняў, Беларусь па-ранейшаму застаецца пры сваіх інтарэсах і працягвае рэалізоўваць палітыку ў адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі, у тым ліку праз удзел у розных прапануемых Захадам праектах, цэнтральным з якіх у цяперашні час з'яўляецца ініцыятыва ЕС «Усходняе партнёрства».

Варта канстатаваць, што гэтая праграма (яна ўяўляе сабой, па сутнасці, абалонку, якая можа быць напоўнена любым зместам у залежнасці ад бягучай кан'юнктуры) была неадкладна ўзята на ўзбраенне сіламі, што імкнуцца выкарыстаць працэс паляпшэння беларуска-еўрапейскіх адносін ва ўласных вузкакарыслівых мэтах. Была зроблена спроба задзейнічаць «Усходняе партнёрства» для аслаблення ўзаемадзеяння Беларусі з Расіяй і ў канчатковым выніку ператварэння рэспублікі ў свайго роду буфер паміж Расіяй і ЕС (па сутнасці — санітарны кардон), а таксама трансфармацыі рэспублікі ў крыніцу танных рэсурсаў, уключаючы працоўныя, і збыту прадукцыі ЕС.

Нездарма адзін з заходніх палітыкаў у гутарцы са сваімі аднадумцамі ў лістападзе 2009 г. заявіў, што «Беларусь — гэта тое месца, дзе яшчэ можна штосьці ўрваць».

Наўрад ці з'яўляецца супадзеннем, што асноўныя афіцыйна дэкларуемыя пастулаты «Усходняга партнёрства» як нельга лепш падыходзілі для ўвасаблення ў жыццё стратэгіі па «дэмакратызацыі» Беларусі: эфектыўнае кіраванне і стабільнасць, эканамічная інтэграцыя з еўрапейскімі палітычнымі працэсамі, энергетычная стабільнасць і усталяванне міжнацыянальных і асабовых стасункаў і, нарэшце, самае галоўнае — «развіццё дэмакратыі».

***Вытрымкі з канфіскаванага дакумента ГК «Гавары праўду»***

***«НОВАЯ СТРАТЭГІЯ ЎЗАЕМААДНОСІН БЕЛАРУСІ І РАСІІ»: ЗАДАЧЫ НОВАЙ СТРАТЭГІІ***

*Прыярытэтная задача новай стратэгіі — садзейнічаць падтрымцы Расіяй на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах Лідара той палітычнай сілы, палітычная платформа якой гарантуе — на працягу года пасля выбараў — змяненне грамадскага ладу і сацыяльна-эканамічнай структуры дзяржавы — змяненне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заснаванне парламенцка-прэзідэнцкай рэспублікі. Выйгрышнасць такога развіцця падзей — відавочная:*

*Перанос цэнтра цяжару «барацьбы за краіну» на парламенцкія выбары — абнадзейвае ўсіх «значных» гульцоў на палітычным рынку Беларусі.*

*Актывізуецца скрытная падтрымка «кандыдата» вышэйшымі дзяржаўнымі чыноўнікамі, старшымі афіцэрамі спецслужбаў і арміі, дырэктарамі дзяржаўных прадпрыемстваў. Бо парламенцкія выбары дазволяць ім у далейшым самастойна змагацца за ўладу.*

*З «пераходнай» фігурай — прэзідэнта-архітэктара новай сістэмы — усе будуць мець справу. І таму — вакол «пераходнай» фігуры, на пераходны перыяд — змогуць аб'яднацца нават «непрымірымыя».*

*Пасля ўстанаўлення парламенцкай формы праўлення ў Беларусі — у краіне з'явіцца не тое каб «кіруемы», але, безумоўна, «больш прадказальны» палітычны лідар.*

*Акрамя таго, сапраўдная структура беларускай эканомікі так ці інакш садзейнічае сітуацыі — «пераможца атрымлівае ўсё». І толькі парламенцкая мадэль можа стаць устойлівай, азначаць «барацьбу па правілах», і ўлічваць інтарэсы ўсіх груп, у якой ніводзін суб'ект не зможа дыктаваць сваю волю ўсім астатнім.*

Менавіта гэтыя мэты былі сфарміраваныя А. Фядутам у праграме У. Някляева.

З улікам сур'ёзнасці ставак пад «Гавары праўду» былі выдзелены салідныя фінансавыя сродкі, а ў аснову метадаў яе рэалізацыі, як наглядна паказалі падзеі 19 снежня, быў пакладзены «ліберальны» прынцып: выкарыстанне любых сродкаў аж да правакавання масавых беспарадкаў і кровапраліцця.

Знойдзены быў і новы твар кампаніі — У. Някляеў.

* * *

## Інфармацыя да разважання

**З тлумачальнай запіскі распрацоўшчыка грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» (далей ГК ГП) А. Фядуты аб праведзенай рабоце па развіцці ГК ГП:**

«У. Някляеў — прадстаўнік так званай творчай інтэлігенцыі. Валодае пэўнай харызмай, працяглы час не ўдзельнічае ва ўнутрыпалітычных працэсах. Не асацыюецца ў насельніцтва з вобразам радыкальнага апазіцыянера, больш вядомы як паэт.



Яго слабыя бакі могуць таксама быць выкарыстаныя намі. У мінулым фактычны алкаголік (хвароба многіх мастакоў). Паводле заключэння нашых экспертаў, гэта стварае ўмовы для фарміравання ў яго звышідэі сваёй выбранасці, прызначэння для здзяйснення вышэйшай місіі. Мы таксама маем на яго істотны кампрамат для дадатковага стымулявання на любой стадыі рэалізацыі праекта.

Мяркуем мэтазгодным выкарыстаць прапанаваную кандыдатуру ў якасці асноўнай для твару кампаніі. Раней прапанаванага кандыдата можна прасоўваць паралельна як запасны варыянт».

* * *

Сёння праваахоўным органам дакладна вядомы акалічнасці сустрэчы ў адной з кавярняў Брусэля, дзе супрацоўнікі іншаземных разведак М., К. і Ш. давалі наказ кіраўніку кампаніі «Гавары праўду».

Гэта цяпер былы кандыдат на пост Прэзідэнта з горыччу шкадуе аб учыненым: «Мяне выкарысталі, як г...н», — а тады гэтым наказам ён быў вельмі натхнёны.

Ужо першапачаткова грамадзянская кампанія «Гавары праўду», цалкам падпарадкаваная волі замежных «куратараў», разглядалася як «запасны доўгатэрміновы праект», арыентаваны не на перамогу ў прэзідэнцкіх выбарах, а на далейшае «змяненне сітуацыі ў краіне» і ўдзел у парламенцкіх выбарах 2012 г.

У арыгінальным тэксце рэкамендацый замежных донараў для Дырэктарата (кіраўніцтва) грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» прадугледжваўся шэраг тактычных установак, у т.л.:

«дыстанцыраванне ад «бесперспектыўнай апазіцыі», прадстаўленай «дэмакратычнымі» палітычнымі партыямі;

задача У. Някляева пасля выбараў — часткова заняць нішу А. Мілінкевіча, пры гэтым не праводзіць з ім якіх-небудзь перамоў;

пазбегнуць сітуацыі, пры якой У. Някляеў становіцца «адзіным».

У. Някляеў неадназова заяўляў у сваім блізкім акружэнні, што яму неабходна «прыгожа сысці з перадвыбарнай гонкі» для таго, каб «застацца палітыкам». Ён быў сур'ёзна настроены на ўдзел у выбарах у Парламент 2012 г. і разам з А. Мілінкевічам бачыў сябе да гэтага часу ў ролі «лідара буйной апазіцыйнай партыі».

Грошай на ўсё гэта Захад не шкадаваў... Паказальная схема з фінансаваннем такога апазіцыйнага інтэрнэт-рэсурса, як Хартыя'97. Гэты сайт вядомы тым, што праз яго вялася агітацыйная кампанія за кандыдата Саннікава. Ніхто нават не спрабаваў хаваць ангажаванасць вышэйназванага рэсурсу. Фінансавым забеспячэннем яго дзейнасці займаўся добра вядомы А. Бябенін. Вось хроніка ўсяго толькі некалькіх месяцаў яго дзейнасці:

— Супрацоўніца «хельсінскай групы ЗША» Кэтрын Фітцпатрык перадае яму грант на суму 211 тысяч долараў;

— Міжнародны фонд «Фронтлайн» на «забеспячэнне бесперапыннай работы сайта» выдзяляе Бябеніну 6 тысяч еўра;

— Арганізацыя «Альянс лібералаў і дэмакратаў «За Еўропу» пералічвае на падтрымку дзейнасці Хартыі'97 26,5 тысячы еўра;

— Нарвежскі Хельсінскі камітэт перадае 98 тысяч долараў.

Гэта толькі невялікая крыха тых сродкаў (гаворка ідзе пра некалькі месяцаў), якія з падачы замежных спецслужбаў выдаваліся на патрэбы Саннікава рознымі фондамі і арганізацыямі на правядзенне інфармацыйнай кампаніі альтэрнатыўных кандыдатаў. І гэта ўжо ніякая не дабрачыннасць, гэта палітычныя ўклады да запатрабавання...

Для стварэння славутай тэлевізійнай карцінкі, якая займае асаблівае месца ў сцэнарыях «каляровых рэвалюцый», выкарыстоўваецца наступная тэхналогія. Эмацыйна падагрэтыя, натоўп моладзі вядуць абучаныя людзі, якія бяруць на прыступ уплывовую дзяржаўную ўстанову, пранікае ўнутр, разбурае ўсё і вывешвае пераможныя флагі. У рэжыме рэальнага часу гэта транслюецца па ТБ, і карэспандэнты даюць паведамленні аб тым, што «дэмакратыя перамагла» і ўлада перайшла да новага палітычнага класа.

# АДНОЙ ЗМОВЫ

Гэтую навіну адразу ж падхопліваюць усе камунікацыі, на працягу гадзіны—дзвюх адпаведныя дыпрадстаўніцтвы разглядаюць падзеі як факт, што адбыўся, і гаворка ідзе пра афіцыйнае прызнанне новых пераможцаў. Прынята лічыць, што назад адкруціць гэты працэс ужо немагчыма. Так было ў Сербіі і іншых краінах, дзе тэхналогіі «каляровых рэвалюцый» у выніку аказаліся ў выйгрышу.

Падзеі на пл. Незалежнасці паказалі, што некалькі соцень тэлежурналістаў прыбылі ў Мінск з-за мяжы толькі дзеля гэтай карцінкі. На выбарчых участках яны не з'яўляліся, але, як па камандзе, суправаджалі кандыдатаў (Някляеў, Статкевіч, Саннікаў) і стаялі на прыступках Дома ўрада, чакалі пачатку здымак... Дзіўна, але ў іх шэрагах было мала шараговых рэпарцёраў. Сярод тых, хто павінен быў даць карцінку, быў, напрыклад, кіраўнік усяго вяшчання навін расійскага Першага канала Антон Вярніцкі. Зоркі «крызіснага рэпартажу» прыехалі з Варшавы, Берліна, іншых еўрапейскіх сталіц. Большасць з іх былі знаёмыя па сумесных акцыях ва Украіне, Кыргызстане і Малдове. Такая пільная і спецыфічная ўвага прэсы да беларускіх выбараў сведчыць аб тым, што сам электаральны працэс мала каго цікавіў. Ангажаваная прэса ўзгоднена прыехала асвятляць чарговую «каляровую рэвалюцыю», хоць быццам бы ніякіх перадумоў да гэтага ў Беларусі не было відаць, і заходнія палітыкі гэта публічна прызнавалі.

Факты і існуючыя дакументы, якія былі пацверджаныя логікай развіцця падзей 19 снежня, сведчаць аб наступным.

Прыкладна да пачатку 2009 года аналітыкі заходніх спецслужбаў (у першую чаргу Польшчы і Германіі), якія ўважліва адсочваюць палітычныя падзеі ў Беларусі, прыйшлі да салідарнай думкі і праінфармавалі свае ўрады аб тэрміновай неабходнасці карэктаваць існуючыя падыходы ў адносінах да Мінска. У прыватнасці, было прызнана, што пастаянная канфрантацыя, крывадушнасць і несумленнасць «традыцыйных» кіраўнікоў беларускіх палітычных партый і рухаў прывялі іх да поўнай дыскрэдытацыі ў вачах грамадскасці. Сістэма, якую стварыў былы кіраўнік германскай знешняй разведкі (БНД) Вік, які стварыў у Беларусі легендзіраваную сетку, якая ў афіцыйных дакументах называлася «Аб'яднанай апазіцыяй», распалася ў выніку разнавектарных інтарэсаў яе кіраўнікоў. Гэта было звязана перш за ўсё з тым, што «адзіны кандыдат» ад дэмакратычных сіл Мілінкевіч быў выкрыты ў адкрытым лабіраванні польскіх знешнедыпламатычных інтарэсаў, вольным расходаванні фінансавання, што выдзялялася, і махінацыях, звязаных з дзейнасцю сваёй жонкі І. Кулей. У значнай меры дыскрэдытаваў сябе і шматгадовы кандыдат на лідарства Лябедзька, які стаў удзельнікам цэлага шэрагу скандалаў, у тым ліку і фінансавага характару. Аналітыкі польскіх і германскіх


Фота БЕЛТА.

**Гэтых хуліганаў і пагромшчыкаў непасрэдна да Дома ўрада прывялі Статкевіч, Рымашэўскі, Саннікаў, Халіп, іншыя падбухторшчыкі і правакатары. Лялькаводамі выступілі заходнія спецслужбы, якія шчодра прафінансавалі праз міжнародныя фонды і адкрытую змову супраць законнай улады Беларусі.**

спецслужбаў адзначалі таксама і такі факт. Інтрыгі і публічныя скандалы ў БНФ прывялі да поўнага падзення аўтарытэту гэтай апазіцыйнай партыі. Фіксаваліся фактычны распад і атамізацыя найбуйнейшай апазіцыйнай партыі БСДПГ. Адзначалася, што на парламенцкіх выбарах, нягледзячы на ўсе намаганні, што рабіліся заходнімі палітычнымі і фінансавымі цэнтрамі, апазіцыя не змагла правесці ў органы ўлады ніводнага дэпутата. У сваіх дыскрэтных паведамленнях аналітыкі адзначалі, што справа тут не ў «ціску ўлады» і не ў фальсіфікацыі выбараў. Адзначаліся арганізацыйная слабасць апазіцыі, крадзеж сум, выдзеленых для правядзення гэтай работы, поўны разрыў апазіцыйных палітыкаў і актывістаў з электаратам. Аналітыкі прапаноўвалі сваім урадам не абмяжоўвацца «касметыкай», а радыкальна змяніць карціну. Мелася на ўвазе прыняцце вычарпальных мер, перш за ўсё стварэнне практычна новага апазіцыйнага асяроддзя. Па задумцы спецслужбаў і падкантрольных ім фондаў, якія працавалі пад прыкрыццямі культуралагічных арганізацый, планавалася наступная работа. 1) Вызначыць у Беларусі людзей, знаёмых з сучаснымі палітычнымі тэхналогіямі, якія маюць практычны вопыт удзелу ў буйных выбарчых кампаніях. 2) Уступіць з імі ў перамовы, у працэсе чаго ўцягнуць у супрацоўніцтва. 3) Прапанаваць гэтым асобам скласці план паслядоўных дзеянняў. 4) Скласці агульны каштарыс фінансавання гэтай праграмы. Далей па адпаведных методыках рэкамендавалася правесці рэкруцінг і абучэнне актывістаў, якія ўдзельнічалі ў новым праекце. Кіраўнікоў праекта «Гавары праўду» пасля стараннай праверкі прапаноўвалася праверыць праз існуючыя апаратыўныя магчымасці, у тым ліку прапусціць праз «дэтэктар хлусні». Пасля атрымання здавальняючых вынікаў кіраўнікі павінны быць азнаёмленыя не толькі са сваімі непасрэднымі куратарамі, як правіла, афіцэрамі разведкі, што працуюць пад прыкрыццём гуманітарных фондаў, але і прадстаўленыя кіраўнікам найбуйнейшых дзяржаў ЕС і ЗША. Пасля правядзення ўсіх падрыхтоўчых мерапрыемстваў кіраўнікі праекта пасвячаліся ў мэту задуманага. Мэта была ў наступным. Паколькі спробы «мяккай дэмакратызацыі» і падобных намаганняў у выніку слабасці і раз'яднанасці апазіцыі фактычна праваліліся, то неабходна засяродзіцца на стварэнні новых масавых структур, якія змогуць выкарыстаць будучыя прэзідэнцкія выбары як рашучую атаку на ўладу. Пры гэтым недвухсэнсоўна ўказвалася, што не варта спыняцца ні перад чым. У выпадку, калі беларускія выбаршчыкі ўсё ж аддадуць перавагу дзейнаму Прэзідэнту, то неабходна стварыць абстаноўку, якая дазволіць вывесці на вуліцы спецыяльна падрыхтаваных і аплачаных баевікоў, задача якіх будзе складацца ў тым, каб захапіць адзін з урадавых будынкаў, навязаць сілавую барацьбу органам правапарадку, справакаваць уладу і фактычна сарваць выбары. Кіраўнікоў праекта «Гавары праўду» запэўнілі, што ў гэтым выпадку шэраг урадаў краін ЕС выступіць кансалідавана, асудзіць дзеянні ўлады, маральна і матэрыяльна падтрымае тых, хто пацерпіць у выпадку сілавога выхаду на «плошчу», і паспрабуюць дабіцца дыскрэдытацыі Беларусі на міжнароднай арэне.

Пад прыкрыццём ветлівых усмешак і запэўніванняў у карэктнасці ў Мінск у літаральным сэнсе чамаданамі перавозіліся сотні тысяч долараў. Яны ішлі на стварэнне створаных падчас рэалізацыі ГК ГП магутных структур, агітацыйнай і арганізатарскай накіраванасці. Кіраўнікі гэтых структур запрашаліся ў сталіцы шэрагу краін Еўрапейскага саюза і Вашынгтон, дзе дзяржаўныя кіраўнікі не толькі абнадзейвалі мінскіх «рэвалюцыянераў», але і гарантавалі ім прамую маральную і фінансавую падтрымку. Некаторыя паслы краін Еўрасаюза ў літаральным сэнсе ўзвальвалі на сябе абавязкі інструктараў і папячыцеляў для тых, хто павінен быў сілай і хітрасцю змяніць уладу ў Беларусі.

Гэтая разнапланавая работа праводзілася на працягу некалькіх месяцаў.

У той час, калі спсп. Сікорскі (Польшча) і Вестэрвеле (Германія) наведвалі Мінск і афіцыйна запэўнівалі Урад Беларусі ў шчырым жаданні дапамагчы развіццю дэмакратыі, афіцыйныя асобы з шэрагу пасольстваў выконвалі непрыстойную ролю падпальшчыкаў. Трэба думаць, што гэтыя крывадушныя дзеянні ўсялілі ўпэўненасць у тых «паліттэхнолагаў», якія палічылі, што супраць добра змазаных валютай інструментаў «каляровай рэвалюцыі» супрацьяддзя няма і не можа быць! На абсалютную большасць беларускага народа, на яго волевыяўленне асаблівай увагі не звярталася. У сваіх разліках арганізатары і ідэолагі чарговай «рэвалюцыі» рабілі стаўку на грошы, якія павінны былі б стаць усеразбуральнай сілай.

На Захадзе не маглі не бачыць, што сярод кандыдатаў у Прэзідэнты няма ніводнай рэальнай значнай фігуры, хто меў бы хоць якуюнебудзь зразумелую палітычную праграму і электаральны аўтарытэт. Тыя, хто за авантуру расплачваўся грашыма еўрапейскіх падаткаплацельшчыкаў, цудоўна разумелі, што ў выпадку поспеху «рэвалюцыі» ў цэнтры кантынента немінуча ўзнікне крызіс, што Беларусь умыецца крывёю. Але на гэта ніхто ўвагі не звяртаў. Галоўным было змясціць Лукашэнку, паставіць на чале краіны нейкую паслухмяную марыянетку і спакойна назіраць пакуты народа, якога штучна ўвагналі ў хаос.

Гэта — кароткі пераказ задумы, прывезенай у краіну арганізатарамі і натхняльнікамі чарговай «каляровай рэвалюцыі», якая правалілася.

Нягледзячы на абмежаванасць людскіх рэсурсаў, што падтрымліваюць радыкальную апазіцыю, яе замежныя спонсары мэтанакіравана арыентавалі арганізатараў несанкцыянаванай акцыі пратэсту на збор 100 тыс. чалавек.

Пры гэтым агучваліся два магчымыя варыянты развіцця падзей. Першы зыходзіў з таго, што на «плошчы» збяруцца 100—150 тысяч, пры якіх гвалтоўны захоп улады быў найбольш рэальны. Таму задоўга да 19 снежня Дом урада быў выбраны ў якасці асноўнага аб'екта для захопу апазіцыяй.

Другі план меў на ўвазе наяўнасць на «плошчы» не больш як 10 тысяч чалавек, што, на думку лідараў ГК ГП, дазволіла б хоць неяк сябе паказаць і апраўдаць сваю дзейнасць перад замежнымі спонсарамі.

М. Статкевіч заяўляў у «незалежных» СМІ аб «трох варыянтах развіцця падзей» пасля выбараў: «Калі 100 тысяч і больш людзей прыйдуць на плошчу — гэта будзе свабодная і шчаслівая краіна; калі значна менш, але яны будуць рашуча змагацца, — то Беларусь таксама зменіцца да лепшага, няхай і не адразу; калі ж «плошча» пройдзе па прынцыпе «прыйшлі, пастаялі, паслухалі музыку і разышліся — краінай канчаткова авалодае страх і безнадзейнасць».

**(Працяг на 4-й стар.)**

# ЗА КУЛІСАМІ

На Кастрычніцкай плошчы Мінска, трымаючыся нарыхтаванага і ўхваленага замежнымі экспертамі сцэнарыя, Андрэй Саннікаў зрабіў сенсацыйную аб'яву: «Рэжым Лукашэнкі паў, створаны ўрад народнага выратавання, у які ўвайшлі кандыдаты ў Прэзідэнты». Далей Саннікаў заклікаў прысутных ісці да Дома ўрада, дзе, паводле яго слоў, адбудуцца перамовы з уладай, якая капітулявала. Аплачаныя правакатары ровам і авацыямі сустрэлі гэты заклік, легкаверныя людзі рушылі за імі на Кастрычніцкую плошчу, да Дома ўрада. Відавочна тое, што была агучана грубая хлусня, але, па сутнасці, было аб'яўлена аб дзяржаўным пераваροце і многія людзі былі ўцягнутыя ў абсалютна антызаконную і небяспечную акцыю. Далейшае вядома. Улада не стала мірыцца з беззаконнем і навяла парадак.

На месца пагрому прыбыў АМОН, на працягу некалькіх хвілін плошча была ачышчана.

Вялікі пшык, т.зв. «снежаньская рэвалюцыя» бясслаўна завяршылася.

На сваёй прэс-канферэнцыі 20 снежня Прэзідэнт даў указанне спецслужбам апублікаваць для інфармавання грамадскасці рассакрэчаныя дакументы, якія павінны паказаць падаплёку таго, што адбылося, бескампрамісна назваць імёны арганізатараў, натхняльнікаў і ўдзельнікаў беспарадкаў, у тым ліку і замежных, абнародаваць схемы фінансавання дэструктыўных арганізацый, патлумачыць, як пад шырмай сейбітаў «дэмакратыі» арудуюць людзі, для якіх нічога не каштуе ў XXI стагоддзі ў еўрапейскай краіне спланаваць і паспрабаваць наладзіць штучную і згубную «рэвалюцыю». З цынічнай і нахабнай мэтай навязаць народу іншы палітычны лад.

Магчыма, некаторых чытачоў шакіруюць лічбы фінансавых паступленняў, што ідуць да нас для падсілкоўвання «рэвалюцыянераў» з Захаду. Магчыма, у кагосьці выклічуць агіду паводзіны некаторых дыпламатаў і прадстаўнікоў спецслужбаў, якія груба ўмешваюцца ва ўнутраныя справы нашай краіны... Хтосьці, азнаёміўшыся з рассакрэчанымі дакументамі, з тэлефоннымі перагаворамі галоўных дзейных асоб, падцісне вуснЫ, маўляў, што гэта за татальны кантроль? Не спяшайцеся рабіць высновы, спадары! Па-першае, усе прававыя дзяржавы пакідаюць за сабой права кантраляваць дзейнасць дэструктыўных палітычных груп, каб перашкаджаць тэрарызму і масавым беспарадкам. Падругое, пасля заведзенай па факце пагрому крымінальнай справы тэлефонныя размовы «дзейных і замешаных» асоб падлягаюць праверцы. Так наказвае закон! Па-трэцяе, калі б запушчаны працэс «каляровай рэвалюцыі» набраў ход, спыніць яго было б вельмі цяжка. Таму адпаведныя дзяржаўныя органы не толькі пільна адсочвалі абстаноўку, якая складвалася, але і змаглі на працягу некалькіх хвілін аднавіць парадак і законнасць. Вінаватым у падбухторванні і беспарадках, іншых учынках прад'яўлены ў адпаведнасці з законам абвінавачанні.

## ПЛАНАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ

### Вытрымкі з канфіскаванага «Стратэгічнага плана ГК ГП»

«Магчымыя дамінанты будучай контрпрапагандысцкай кампаніі. Фонавая кампанія (чуткі)».

«...Адным з элементаў кампаніі ў падтрымку кандыдата нацыянальнага даверу павінна стаць мэтанакіраванае прадуцыраванне імпульсаў для распаўсюджвання чутак. Чуткі — гэта інфармацыя, якая перадаецца з вуснаў у вусны і носіць вірусны характар распаўсюджвання. Ідэальным інфармацыйным носьбітам для такой кампаніі служыць інтэрнэт, асабліва сацыяльныя сеткі, блогі, «Твітэр» (сацыяльная інтэрнэт-сетка).

Добра праведзеная кампанія чутак прымушае ўладу пастаянна апраўдвацца, ствараецца так званая прэзумпцыя вінаватасці ўлады, узмацняецца ўзровень недаверу да яе.

Адной з базавых чутак, якая павінна іграць на працягу ўсёй кампаніі, з'яўляецца чутка аб магчымай адстаўцы Лукашэнкі. Яе задача — прывучыць грамадскую думку і думку эліты да самой магчымасці такога адыходу.

Прапануемыя цыклы чутак:

Персона Лукашэнкі і яго сям'я, чуткі аб прэзідэнце аслабляюць яго асабістую пазіцыю, разбураюць імідж моцнага і смелага, рашучага чалавека.

Прыводзім галоўныя накірункі і мэты «фонавай кампаніі»:

— Дрэннае здароўе Лукашэнкі і членаў яго сям'і.

— Лукашэнка лечыцца па мяжой і выдаткоўвае на гэта вялікія грошы.

— Асабісты капітал Лукашэнкі ў замежных банках. Гэтую акалічнасць варта падкрэсліваць і пастаянна павялічваць сумы.

Эканоміка. Чуткі аб эканамічных праблемах павінны супрацьдзейнічаць звесткам, што краіну крызіс амаль не закрануў.

Эфектыўная таксама наступныя чуткі:

— Звольненых з кожным днём усё больш, наперадзе новыя звальненні.

— Краіну распрадаюць танна, прыватызацыя прадпрыемстваў ідзе скрытна і поўным ходам. Чыноўнікі за хабары распрадаюць дзяржаўную ўласнасць арабам і кітайцам.

— Урад не выканаў патрабаванняў МВФ, і патрабуецца датэрміновае вяртанне крэдытаў.

Падвяргаецца сумненню бяспека найбуйнейшых дзяржаўных праектаў.

— Пры будаўніцтве АЭС будзе выкарыстаны кітайскі рэактар, які можа быць выбуханебяспечным.

— Атамны рэактар на АЭС — насамрэч будучыя ракеты, платформа для ядзернага шантажу...».

* * *

### Вытрымкі са «Стратэгічнага плана ГК ГП»

Для стварэння палітычнага крызісу ў краіне неабходна:

«**Першы этап.** Стварэнне ўмоў для дэлегітымізацыі вынікаў галасавання пры дапамозе «незалежнага» назірання, а таксама шляхам подкупу членаў выбарчых камісій.

Дырэктарат «Гавары праўду» прыступіў да вывучэння кіраўніцтва і членаў тэрытарыяльных выбаркамаў і патэнцыяльных кандыдатаў ва ўчастковыя камісіі на месцах. Асаблівы акцэнт рабіўся на т.зв. перспектыўных выбарчых участках, дзе У. Някляеў карыстаўся пэўнай вядомасцю сярод выбаршчыкаў.

Мяркуецца пачаць персанальную работу з членамі камісій і іх кіраўнікамі на выбраных участках, каб на матэрыяльнай аснове схіліць іх да публічных заяў аб фальсіфікацыі аб'яўленых ЦВК вынікаў галасавання і агучвання «рэальных» лічбаў аддаўшых галасы за У. Някляева на канкрэтным участку».

***Даведка.*** *Для схілення службовых асоб да супрацоўніцтва з «кампаніяй» ім была паабяцана «кампенсацыя» ў памеры да 100 тыс. долараў ЗША.*

*ГК ГП разлічвала на тое, што, калі па рэспубліцы з падобнымі заявамі выступяць ад 3 да 5 («а калі атрымаецца, то і больш») кіраўнікоў выбарчых камісій, апаненты ўлады атрымаюць магчымасць «аргументавана» апратэставаць афіцыйныя вынікі выбараў, апеляваць да замежных структур і пачаць «абгрунтаваную» кампанію грамадзянскага непаслушэнства.*

«**Другі этап.** Правядзенне масавых акцый пратэсту. Па меры праходжання асноўных стадый выбарчага працэсу апанентамі ўлады планавалася сінхронна нагнятаць сацыяльную абстаноўку ў краіне, павялічваючы па меры набліжэння даты выбараў колькасць удзельнікаў плануемых акцый пратэсту».

## ФІНАНСАВАННЕ

### З аператыўных матэрыялаў

«А. Міхалевіч адзначыў, што праходзіў навучанне ў Англіі, выязджаў у Польшчу і Германію. У адной з паездак у Германію яму пазваніла жанчына, якая назвалася нямецкай журналісткай А.М., і прапанавала сустрэцца. Падчас гэтай сустрэчы «журналістка» пачала задаваць пытанні, якія не датычыліся раней агаворанай тэмы гутаркі. У прыватнасці, яе цікавілі палітычныя і эканамічныя працэсы, што адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Пасля гэтага А. Міхалевіч яшчэ двойчы сустракаўся з ёю. На думку А. Міхалевіча, гэта была не журналістка, а прадстаўніца спецслужбаў Германіі.

А. Міхалевіч расказаў, што фінансаванне партыі БНФ ажыццяўляецца ў асноўным з ЗША, Германіі і Польшчы. Са слоў А. Міхалевіча, асноўная частка грантаў раскрадалася вярхушкай БНФ, не даходзячы да простых членаў партыі».

* * *

### З аналітычнай запіскі

«Фінансавае становішча кандыдатаў ад апазіцыі.

Адзначана, што ў сувязі з адмовай донараў аказаць фінансавую дапамогу А. Мілінкевічу (экс-кандыдат у Прэзідэнты на выбарах 2006 года, лідар руху «За свабоду») і адсутнасцю грашовых сродкаў на збор подпісаў ён знаходзіцца ў дэпрэсіі. На тэлефонныя званкі па мабільным тэлефоне не адказвае.

Я. Раманчук атрымаў каля **150—200 тыс. долараў ЗША** ад IRI на правядзенне лакальных акцый, пасля чаго паехаў у Германію і ЗША для атрымання дадатковага фінансавання.

А. Казулін балатавацца ў Прэзідэнты не мае намеру, разам з тым за матэрыяльную ўзнагароду гатовы аказваць садзейнічанне кампаніі «Гавары праўду» ў вылучэнні У. Някляева. Удзел у выбарах А. Казулін пазіцыянуе як магчымасць зарабіць грашовыя сродкі».

### Са зводкі

*Падчас папярэдніх перамоў з У. Някляевым А. Саннікаў заявіў, што «супрацоўніцтва з лідарам «Гавары праўду» для яго — удар па рэпутацыі, які будзе каштаваць не менш як **500 тыс. долараў ЗША**.*

«...А. Фядутам (ідэолагам ГК ГП) і А. Вардамацкім (дырэктар даследчай лабараторыі «Новак») абмеркаваны пытанні фінансавання ГК ГП у перыяд выбарчай кампаніі. На збор подпісаў у донараў плануецца атрымаць **каля 400 тыс. долараў ЗША**, на агітацыйную кампанію — **600 тыс. долараў ЗША**. Падчас размеркавання грашовых сродкаў на збор подпісаў Ю. Слуцкая (у мінулым галоўны рэдактар газеты «Комсомольская правда в Белоруссии») заявіла, што ёй на медыйнае суправаджэнне неабходна **100 тысяч**, С. Вазняк (даверaная асоба Някляева) запрасіў **250 тысяч** на выраб друкаванай прадукцыі. Кіраўніцтвам структуры прынята рашэнне аб пераносе гэтага пытання на наступны дырэктарат. Адзначана, што ў верасні А. Дзмітрыеву (кіраўнік штаба Някляева) будзе выдадзена **150.000 долараў ЗША** (А. Фядута — **70.000** і А. Вардамацкі — **80.000**).

# АДНОЙ ЗМОВЫ

З мэтай падрыхтоўкі для ГК ГП аналітычных дакументаў аб сацыяльна-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы А. Фядута прапанаваў выдзеліць **са свайго пазабюджэтнага фонду 50.000—100.000 долараў ЗША** для арганізацыі работы знешніх кансультантаў ГК ГП (В. Сіліцкі і інш.). На наступным Дырэктарацe ім будзе прадстаўлены спіс кансультантаў і іх заработныя платы.

А. Фядута паведаміў, што на яго ініцыятыўна выйшаў старшыня ЛДП С. Гайдукевіч (лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі), які прапанаваў за **1.000.000 долараў ЗША** аказаць садзейнічанне кампаніі «Гавары праўду» па прасоўванні яе кандыдата на будучых выбарах і зняць сваю кандыдатуру ў яго падтрымку. Члены Дырэктарата палічылі, што гэта — правакацыя праваахоўных структур. А. Фядута адзначыў, што, магчыма, С. Гайдукевіч з'яўляецца правадніком дыялогу з уладай.

С. Вазняк паведаміў, што ў «Гавары праўду» ён быў запрошаны асабіста А. Фядутам.

Паводле слоў С. Вазняка, «спонсарамі» ГК ГП з'яўляліся прадстаўнікі «дзяржаўнай структуры» Рэспублікі Польшча (МЗС Польшчы).

Іншаземцы кантактавалі выключна з выбранымі імі кіраўнікамі «кампаніі»: першапачаткова з А. Фядутам і далей (прыкладна з мая 2010 г.) з А. Дзмітрыевым і У. Някляевым.

У задачы С. Вазняка ўваходзіла перапраўка перададзеных яму А. Фядутам і А. Дзмітрыевым за мяжой фінансавых сродкаў у Беларусь. Атрымаўшы грошы ад названых асоб, ён (асабіста са спонсарамі не кантактаваў) павінен быў даставіць іх у РБ».

* * *

## З аператыўнай зводкі органаў дзяржбяспекі

19 ліпеня, пасля таго, як А. Дзмітрыеў даў згоду кіраўніку NED Р. Патоцкаму прыняць удзел у моладзевай групе па арганізацыі «плошчы», на яго выйшаў лідар «Маладога фронту» (МФ) Д. Дашкевіч з прапановай абмеркаваць план дзеянняў структуры, якая ствараелася. Д. Дашкевіч прапанаваў выклікаць моладзевую групу «Беларусь за свабоду» або «Свабодная плошча». Адзначыў, што ў яе склад увойдуць прадстаўнікі «Маладога фронту», «Правага альянсу», БНФ і руху «За свабоду» або «Свабодная плошча». Каардынатары — Д. Дашкевіч і прадстаўнік «За свабоду».

У пачатку жніўня ў Еўрапейскім саюзе Д. Дашкевіч правядзе азнаямляльную сустрэчу прадстаўнікоў моладзевай групы, дзе будуць распрацаваны прапановы па арганізацыі «плошчы» і бюджэт структуры (мяркуецца да **2.000.000 долараў ЗША** — частка будзе асвоена «МФ»). Паступленне грошай запланавана на верасень. З верасня па кастрычнік у г. Мінску ў спартыўных магазінах і на рынках актывісты структуры будуць закупляць палаткі (каля 500 шт.) і іншы інвентар, якія будуць захоўвацца на канспіратыўных кватэрах. Д. Дашкевіч плануе сабраць на «плошчы» **каля 3.000 чалавек**. У выпадку блакіравання праваахоўнымі структурамі Кастрычніцкай плошчы разглядаецца іншае месца, дзе будзе ўсталяваны палатачны гарадок».

* * *

***Фрагмент электроннай перапіскі па сістэме «Скайп» паміж А. Бяляцкім (віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, Мінск) і каардынатарам ад фонду «Свабода і дэмакратыя» (Варшава)***

**— Добры дзень, гэта Марэк. Ёсць невялікая просьба. Дашлі, калі ласка, звесткі. На англійскай можна?**

— Добры дзень, слухаю.

**— Просьба такая: ці можна з вашага боку — калі хтосьці з Польшчы будзе ў вас пытацца — пацвердзіць, што наш фонд саўдзельнічаў у стварэнні вашай вялікай базы по рэпрэсіях у рамках праекта па рэпрэсіраваных? Наўрад ці хтосьці будзе пытацца, але раптам... Справа ў тым, што наш МЗС хоча ведаць, які інфармацыйны эфект ад нашага праекта. Нам трэба штосьці ім адказаць. Ну вось так і адказалі, што дапамагалі бясплатна. Сам разумееш, у чым тут справа.**

— ОК, добра, калі просяць — пацвердзім.

**— Дзякуй! А што датычыцца гэтага года, то на выплаты для рэпрэсіраваных 200 тысяч злотых. Плюс ганарар для вашай каардынатаршы. 200 тысяч злотых — гэта дзесьці 7 тысяч долараў будзе.**

— Ужо зацвердзілі?

**— Так.**

— Супер!

**— Цяпер чакаем грошай на рахунак. І можа, мы з вамі папярэдне потым узгоднім у Варшаве, хто атрымае?**

— Я думаю, што можна будзе вызначыцца.

**— МЗС урэзаў напалову. Мы прасілі 500 тысяч злотых.**


CIVIL RIGHTS DEFENDERS

Page 1 of 5 Grant Contract 2010

GRANT CONTRACT

Civil Rights Defenders, on the one side, and Human Rights Center Viasna ("the Beneficiary") with its office at Nezalezhnastsi Avenue, 78a-48, Minsk, Belarus, on the other side, have agreed as follows:

Article 1 - Preferences

1(1) The subject of this Contract is a grant from Civil Rights Defenders, which shall be used according to the approved budget for the project entitled: Work of public reception rooms at the branches of HRC Viasna, project no. 1031106 ("the Project"). The approved application and budget attached, forms an integral part of the Contract. The Beneficiary will be awarded the grant on the terms and conditions set out in this Contract, which the Beneficiary hereby declares he has taken notice of and accepts.

1(2) This Contract shall enter into force after being signed by both Contracting parties. The Project shall be finished not later than April 30 2011.

1(3) The total grant is estimated at EUR 111 700 .

1(4) Payment will be made in accordance with the following: EUR 55 850

Advance (50% of the grant): EUR 27 925

Second payment (subject to the provisions laid down in Article 3): EUR 27 925

Final payment (subject to the provisions laid down in Article 3)

Payments will be made into the following bank account:

Number: LT 66 4010 0424 0235 8715

Swift code: AGBLLT2X

Holder: Bialiatski Aliaksandr

Name and address of bank: AB DnB NORD, Pilies g. 36, LT-01123 Vilnius Lithuania

For the Beneficiary:

26.05.2010

Date and Signature (of Person Authorised to Sign)

Full Name and Title

Aliaksandr Bialiatski Chairman

For Civil Rights Defenders:

Date and Signature

Erik Eskjörnson, Programme Director

CIVIL RIGHTS DEFENDERS

**Копія кантракта на атрыманне гранта праваахоўным цэнтрам «Вясна» ад «Абаронцаў грамадзянскіх правоў». Сродкі выдаткоўваліся на праваабарончую дзейнасць, але выкарыстоўваліся вельмі адвольна...**

— Літаральна сёння і пачнём тады. Але і гэта добра, бо ў нас ёсць каля 40.000 з НЭДа, але палову з іх мы ўжо выдаткавалі...

**— Там поўнае выкраданне грошай ідзе. Далі камусьці ў Беларусь на два праекты па супрацоўніцтве ў галіне... ветэрынарыі. 10 працэнтаў усіх грошай МЗСа на замежную дапамогу атрымала адно аграпрадпрыемства з паўночнай Польшчы! Два з паловай мільёны злотых ім далі! Карупцыя поўная.**

— Ад нас гэта далёка... вам бачней...

**— А ўчора вашым апазіцыянерам Сікорскі выхваляўся, што ён вельмі дапамагае рэпрэсаваным, і даваў прыклад нашага праекта. Хлусня татальная.**

— Ха-ха-ха!!! Баюся, што ПАЛІТЫКІ, ЯНЫ ўсе такія.

* * *

## З аператыўнай зводкі

«У шэрагу выпадкаў С. Вазняк выклікаў рэгіянальных каардынатараў ГК ГП у Вільнюс, дзе ў абумоўленым месцы (гасцініца альбо кавярня) выдаваў кожнаму агаворану суму ў наяўнай валюце.

У іншых выпадках С. Вазняком была распрацавана іншая схема. Так, атрымаўшы грошы ад А. Дзмітрыева, ён размяркоўваў выдадзеную яму суму па камерах захоўвання на чыгуначным вакзале Вільнюса (альбо па банкаўскіх ячэйках). Далей, звязаўшыся па сістэме «Скайп» з рэгіянальнымі каардынатарамі, ён называў кожнаму нумар, код ячэйкі, дату і час, калі названаму функцыянеру альбо выбранай ім асобе неабходна было прыбыць у Літву і забраць грошы.

Такім чынам, С. Вазняк персанальна дыстанцыраваўся ад асабістага ўдзелу ў раздачы грошай, а абазначэнне зададзенай даты дазваляла ўпэўніцца ў тым, што кур'еры не змогуць убачыць адно аднаго падчас вымання сродкаў з названых камер захоўвання ў Літве.

Грошы перапраўляліся ў Рэспубліку Беларусь толькі ў выглядзе наяўнай валюты выбранымі кур'ерамі.

С. Вазняк адзначыў, што летам 2010 г. ён атрымаў ад А. Дзмітрыева ў Вільнюсе сумку з вялікай сумай наяўнай валюты (па асабістай ацэнцы — **больш за 700 тыс. долараў ЗША**).

## ТАЙНА СЛЕДСТВА

Няма ніякіх сумненняў, што да падзей 19 снежня прыклалі руку перш за ўсё спецслужбы Польшчы і Германіі, якія спланавалі і арганізацыйна афармілі ГК ГП, якая па задуме павінна была стаць «Новай апазіцыйнай сілай», здольнай змяніць уладу ў краіне. Для дасягнення гэтай мэты былі падабраны арганізатары і тэхнолагі, прыцягнуты буйныя фінансавыя сродкі, якія пад «дахам» розных фондаў кантрабандна перапраўляліся ў Беларусь. Палігонам для арганізацыйнага фарміравання сілы, здольнай змяніць у Беларусі законную ўладу, стала Польшча. Там былі наладжаны спецыяльныя і трэніровачныя лагеры для «актывістаў», там рыхтаваўся будучы кіруючы клас, там узгадняліся асноўныя знешнепалітычныя рашэнні з прыцягненнем дыпламатычнага корпусу. Усё гэта выклікае шкадаванне, хоць бы таму, што народ брацкай Польшчы мае самыя цесныя сувязі з беларускім народам. Шкада, што гэтага не хочуць разумець некаторыя палітыканы.

Як вядома, цяпер асноўныя падбухторшчыкі і завадатары арыштаваныя, ім прад'яўлена абвінавачанне, ідзе следства, якое расставіць усё па сваіх месцах. Гэтых людзей затрымалі не за іх палітычныя погляды. Іх арыштавалі за канкрэтныя дзеянні, якія выявіліся ў т.л. у спробе захапіць Дом урада і ўцягнуць краіну ў хаос. За стварэнне незаконнага «ўрада».

**(Заканчэнне на 6-й стар.)**

# ЗА КУЛІСАМІ АДНОЙ ЗМОВЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1 —5)**

Прыводзіцца фрагмент допыту аднаго з фігурантаў крымінальнай справы, які пралівае святло на многія падзеі. І перш за ўсё на актыўны ўдзел у мінскіх падзеях афіцыйных прадстаўнікоў з Варшавы і Берліна.

* * *

## З пратакола

**Супрацоўнік (М) задае пытанні высокапастаўленаму функцыянеру ГК ГП (М1)**

«М1. Наконт крыніцы грошай я вам ужо ўчора сказаў, мая думка будзе нязменнай, мне ўсё адно, хто што скажа. Гэта нямецкія грошы, гэта нямецкая палітыка. І далей, гэта проста выкарыстанне краін, якія, скажам, да Германіі маюць непасрэднае дачыненне.

**М. Гэта Польшча і краіны Балтыі?**

М1. Гэта ў асноўным Балтыя, гэта Польшча, гэта крыху Швецыя. Цяпер не маецца на ўвазе фінансава, тут маецца на ўвазе арганізацыйна. І тут у мяне няма іншага адказу, я гэта казаў.

**М. Зразумела.**

М1. Я зусім упэўнены, калі ўчора гаварылі наконт Мілінкевіча, я якраз лічу, што проста Германія зрабіла так, каб Мілінкевіча сярод фінансаваных не было. Гэта была, магчыма, нейкая дамова, а не адабранне грошай у Мілінкевіча.

**М. Скажы, вось дзесьці месяц таму ты ездзіў у Польшчу, калі ўзніклі першыя праблемы «перагону» грошай, з кім ты там кантактаваў?**

М1. Калі я быў з Някляевым, вы маеце на ўвазе?

**М. Так, нібыта ты быў з Някляевым.**

М1. Дык гэта быў афіцыйны візіт.

**М. З кім гутарылі наконт фінансавання?**

М1. Я там з усімі размаўляў наконт фінансавання. Мы размаўлялі з Літвіным (намеснік міністра замежных спраў Польшчы) і з людзьмі, якія нам назваліся, як з канцылярыі. Гэта значыць, мы з імі гутарылі як просьбіты: «Так, нам патрэбны дадатковыя сродкі, ці можаце вы нам чым-небудзь дапамагчы?» Плюс у нас там была вельмі важная сустрэча, дарэчы, менавіта ў Польшчы ў нас была вельмі



Урад народнага выратавання

1. Адміністрацыя
   1. МУС - Сіўчык, Грыб, Воўчак
   2. МЗС - Лябедзька, Саннікаў, Мілінкевіч, Рымашэўскі, Крайчанка, Макоўскі
   3. Мінабароны - Статкевіч, Бароўка, Камароўскі
   4. БСБ - Аўтоховіч, Барадач, Кабанчик В.
   5. Мін'юст - Луканін, Пастухоў, Гулак, Альфер
   6. Адмін. рэформы самакір.- Кобаса, Пліска, Марыніч, Міхалевіч
2. Эканамічны
   1. Фінансаў - Багданкевіч, Раманчук, Чубрык
   2. Эканомікі - Чалы, Злотнікаў, Залескі, Зьмітрук
   3. Энергетыкі - Гусак, Манёнак
   4. Прамысл. - Вайтовіч, Клімовіч, Быкаў, Бухвостаў
   5. С/г - Нікітчанка, Баўсюк
   6. Прыр. Рэсурсы – Дранчук В., Масквіч, Лукашоў, Севярынец
   7. Транспарту і камунікацыяў – Кастусёў
3. Сацыяльны
   1. Мін'інформ - Марцаў, Старыкевіч, Дынько, Шэін, Літвіна
   2. Мін'адукацыі - Барычэўскі, Трусау, Колас, Нагорны, Мацкевіч, Лозкі
   3. Мін'культуры - Някляеў, Марачкін, Мазынскі, Каржанеўскі
   4. Спорт і турызм - Каныгін, Купрэйчык, Садоўскі Д.
   5. Працы і сац. развіц - Ярашук, Грушавы, Сасноў, Скарабагаты, Кісель
   6. Сям'і і моладзі – Дашкевіч, Карэтнікаў, Кім, Лысюк, Логвіг
   7. Рэлігіі і нац – Шаўцова, Сапяжынскі
   8. Аховы здароў'я – Баньжэўскі, Вітушa

важная сустрэча з немцамі.

**М. А з якімі немцамі?**

М1. Там была падборка экспертаў.

**М. Хто арганізоўваў сустрэчу з палякамі?**

М1. Немцы і арганізоўвалі для нас сустрэчу з палякамі. Але я ўжо таксама гаварыў учора, што калі мы былі ў прыёмнай, мне памочніца кінула такую фразу, што...

**М. У прыёмнай у каго?**

М1. Па-мойму, у Літвіна, я цяпер ужо... Кінула такую фразу... або прыёмная Сікорскага, або прыёмная Літвіна, не памятаю, чыя гэта памочніца была, якая кінула фразу: «Вы павінны быць удзячныя вашай сустрэчы ў Польшчы».

**М. А як ты лічыш, у сувязі з чым было скарочана фінансаванне? Крыху сталі самастойнымі?**

М1. Не, прэзідэнцкія выбары, яны павінны былі быць прамежкавымі, мэта — пацыху ўваходзіць у парламент, такім чынам, легалізацыя адносін і нібыта работа з Беларуссю. І прэзідэнцкія выбары павінны былі быць проста этапам. Мы павінны былі сябе паказаць, мы павінны былі праявіць лідарства, мы павінны былі сфарміравацца як новая апазіцыя, з якой будуць размаўляць у Еўропе.

**М. Гэтую стратэгію хтосьці агучваў?**

М1. Гэтую стратэгію не агучвалі, у апошні раз у Брусселі проста сказалі Някляеву, не так, як можа быць, але ў прынцыпе Някляеву сказалі: «Мы зацікаўленыя ў тым, каб выбары былі прызнаныя настолькі, наколькі гэта Еўропа можа прызнаць, што гэта быў дыялог і гэтак далей. Мілінкевіч ужо адыграны, і ніхто з ім не будзе працягваць дыялог, патрэбен новы лідар, новая структура, гэта дасць нармальную магчымасць весці міжнародную палітыку, але пры гэтым будзе паралельны дыялог. Адпаведна ў далейшым, калі раптам гэтая структура пачне дыялог з уладай, усе будуць гэтаму дыялогу давяраць. Гэта значыць, Еўропа зможа яго падтрымліваць. Ёсць людзі, дыялог з якімі, хоць іх і лічаць апазіцыяй, яны апазіцыяй для іх не з'яўляюцца. Цярэшчанка, Гайдукевіч, цяпер ужо Міхалевіч. Еўропа не можа прыняць такую апазіцыю, для яе гэта немагчыма з-за палітычных прычын. Патрэбна апазіцыя, якая будзе такая дастаткова, ну не радыкальная, але апазіцыя, тады пачнецца дыялог, які будзе ўсім выгадны».

### ...Працяг гутаркі

**«М. Фядута ад'язджаў з дакументамі якімі-небудзь?**

М1. Так. Мы працягвалі працаваць, ён там ад'язджаў, вяртаўся. Але ў цэлым стратэгію напісалі мы, гэта значыць, там не было кагосьці, хто нам гаварыў, як правільна. Вы ведаеце, я вось думаю, адзін з варыянтаў, напрыклад, чаму не сказалі адразу там, што Германія. Адзін з варыянтаў можа быць: таму што Германія ніколі не працавала з вялікімі праектамі тут палітычнымі. Магчыма, гэта такая спроба, скажам, спусціцца на тых, хто з'яўляецца прывычнымі спонсарамі, кшталту краіны Балтыі, Польшча тая ж самая. Гэта значыць спусціцца на тым, што будзе прывычна для ўлады. З іншага боку, у выпадку, напрыклад, правалу Германія застанецца, самі разумееце, з незаплямленай рэпутацыяй. Бо можна было проста дамовіцца з Польшчай, каб Польшча больш не фінансавала.

**М. Хто спрабаваў арганізаваць дыялог Мілінкевіча? Германія? Гэта ў дачыненні да пытання, удзельнічала яна ў праектах якіх-небудзь або не.**

М1. Мне проста здаецца, што Польшча не самастойны гулец у такой палітыцы.

**М. Але яна вельмі хацела быць самастойным гульцом. Я разумею, пра што ты гаворыш. Але ёй проста маглі даць якія-небудзь паўнамоцтвы, шанц.**

М1. Зыходзячы з апошніх нашых сустрэч, дзе ўжо былі размовы з Вестэрвеле, мне якраз здавалася, што ў выпадку працягу Германія будзе больш выходзіць з ценю.

**М. А ініцыятыва сустрэчы зыходзіла ад каго?**

М1. Ініцыятыва сустрэчы з Вестэрвеле?

**М. Так.**

М1. У нас не было сустрэчы, у нас была тэлефонная размова Някляева з ім. Але гэта была ініцыятыва нямецкага боку, калі мы былі ў Брусселі.

**М. А пра што яны гаварылі?**

М1. Там нейкія агульныя рэчы. Ён пацвердзіў тое, што было сказана на сустрэчы ў Брусселі наконт таго, што Беларусь павінна рухацца ў еўрапейскім кірунку, што, безумоўна, Расія не будзе так лёгка адпускаць Беларусь...»

**(Працяг будзе.)**

**КАЛЕКТЫВУ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛОРУССКАЯ НИВА»**

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з 90-годдзем выхаду ў свет першага нумара газеты.

У вашага выдання багатая гісторыя і слаўныя традыцыі. «Беларуская вёска», «Сельская газета», а пазней «Белорусская нива» ўсе гэтыя гады расказвала са сваіх старонак пра поспехі і праблемы сельскай гаспадаркі, служыла своеасаблівай трыбунай для абмену прафесійным вопытам, актыўна адстойвала інтарэсы людзей, якія працуюць на зямлі.

І сёння «Белорусская нива» надае прыярытэтную ўвагу пытанням укаранення сучасных тэхналогій, мадэрнізацыі інфраструктуры айчыннага аграпрамысловага комплексу і павышэнню якасці жыцця вяскоўцаў.

Упэўнены, што і надалей газета будзе верным дарадчыкам і надзейным сябрам працаўнікоў сяла. Значны творчы патэнцыял і майстэрства дазволяць вам заваяваць яшчэ большыя папулярнасць у чытачоў і аўтарытэт у журналісцкай супольнасці.

Ад усёй душы зычу супрацоўнікам рэдакцыі невычэрпнага натхнення, дасягнення новых творчых вышынь.

Моцнага вам здароўя, шчасця, дабрабыту і прызнання чытачоў!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ КОДЭКС АБ АДУКАЦЫІ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 13 студзеня 2011 года падпісаў прыняты Палатай прадстаўнікоў і ўхвалены Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Кодэкс аб адукацыі.**

Кодэкс аб адукацыі грунтуецца на дзейных законах («Аб адукацыі», «Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі», «Аб адукацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (спецыяльнай адукацыі)», «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», «Аб вышэйшай адукацыі»), Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 года № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі» і накіраваны на комплекснае і сістэмнае рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы адукацыі.

Кодэкс прадугледжвае стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага, цэласнага механізма прававога рэгулявання адукацыйных адносін, забяспечвае сістэматызацыю і ўпарадкаванне прававых норм, скарачэнне колькасці нарматыўных прававых актаў у гэтай сферы, а таксама ўстараненне іншых існуючых недахопаў у рэгуляванні адукацыйных адносін.

Пры гэтым нормы кодэкса забяспечваюць пераемнасць прававога рэгулявання адукацыйнай сферы і не прадугледжваюць канцэптуальных змяненняў гэтых адносін.

Структурна кодэкс складаецца з агульнай і асаблівай частак, у якіх паслядоўна і сістэмна выкладзены прававыя нормы, што ўсталяксі і апраўдалі сябе, а таксама нормы, запатрабаваныя сучасным станам адукацыйных адносін.

Замацавана сістэма адукацыі, якая склалася на практыцы. Згодна з кодэксам, адукацыя падраздзяляецца на асноўную адукацыю (уключае ўзроўні дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі), дадатковую адукацыю (дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі, дадатковая адукацыя дарослых), спецыяльную адукацыю.

Дакументам вызначаны суб'екты адукацыйных адносін, да якіх аднесены тыя, хто навучаецца, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі, установы адукацыі, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якім прадастаўлена права ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці (у тым ліку названыя адукацыйныя галіны, дзе яны могуць ажыццяўляць такую дзейнасць), устаноўлены правы і абавязкі ўсіх суб'ектаў адукацыйных адносін.

Кодэксам дадзена азначэнне педагагічных работнікаў (прафесарска-выкладчыцкага складу) і ўстаноўлены патрабаванні, якія да іх прад'яўляюцца. Пры гэтым прадугледжана, што педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы, пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю, тыя, хто мае судзімасць, прызнаныя недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі, тыя, хто не мае права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Вызначаны агульныя ўмовы ўзнікнення адукацыйных адносін, а таксама агульныя патрабаванні да парадку прыёму асоб для атрымання адукацыі. Пры гэтым правілы прыёму асоб для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вышэйшай адукацыі І ступені, паслявузаўскай адукацыі будуць зацвярджацца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а для атрымання прафесійна-тэхнічнай і вышэйшай адукацыі ІІ ступені — урадам.

Таксама ўстаноўлены меры сацыяльнай абароны тых, хто навучаецца, якія датычацца ў тым ліку карыстання падручнікамі, забеспячэння харчаваннем, аховы здароўя, выплаты стыпендый, забеспячэння месцамі ў інтэрнатах, прадастаўлення крэдыту на льготных умовах для аплаты першай вышэйшай адукацыі, транспартнага забеспячэння.

Рэгламентаваны ўмовы і падставы прыцягнення тых, хто навучаецца, да дысцыплінарнай адказнасці, парадак прымянення мер дысцыплінарнага спагнання (заўвага, вымова, адлічэнне).

Кодэксам замацаваны патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры атрыманні кожнага віду адукацыі (патрабаванні па працягласці навучальнага года і канікулаў, відах вучэбных заняткаў, якія праводзяцца, колькасці гадзін, што адводзяцца на практыку, напаўняльнасці вучэбных груп (класаў) і іншыя).

Вызначаны падставы для змянення і спынення адукацыйных адносін, а таксама рэгламентавана працэдура аднаўлення асоб, адлічаных з установы адукацыі.

Акрамя таго, дакументам урэгуляваны парадак прадастаўлення тым, хто навучаецца, водпускаў, якія падраздзяляюцца на акадэмічны водпуск, водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў і водпуск для праходжання ваеннай службы.

Вызначаны дакладны пералік дакументаў аб адукацыі і аб навучанні, а таксама асаблівасці выдачы дакументаў аб адукацыі асаблівага ўзору (з адзнакай або з узнагароджаннем медалём). Прадугледжаны новы дакумент аб адукацыі — дыплом даследчыка, што будзе выдавацца асобам, якія паспяхова завяршылі навучанне ў аспірантуры (ад'юнктуры).

Таксама замацаваны ўмовы і парадак размеркавання выпускнікоў.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ўступіць у сілу з 1 верасня 2011 года (з новага навучальнага года) і дасць магчымасць завяршыць працэс кадыфікацыі заканадаўства аб адукацыі, забяспечыць больш поўную адпаведнасць прававых норм сучаснаму стану адукацыйных адносін.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ БРАЗІЛІІ Ў СУВЯЗІ СА ШМАТЛІКІМІ АХВЯРАМІ Ў ВЫНІКУ ПАВОДКІ І АПОЎЗНЯЎ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія Дзілме Русеф у сувязі са шматлікімі ахвярамі ў выніку паводкі і апоўзняў.**

«У Беларусі з вялікім болем успрынялі паведамленне аб шматлікіх чалавечых ахвярах у выніку паводкі і апоўзняў, выкліканых праліўнымі трапічнымі дажджамі», — гаворыцца ў спачуванні. Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста перадаў словы падтрымкі і спачування Прэзідэнту Бразіліі, родным і блізкім загінулых, а таксама пажаданні хутчэйшага выздараўлення і вяртання ў свае дамы ўсім, хто пацярпеў ад стыхійнага бедства.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## На аднаго жыхара — $855,3

**Усярэднім 2565,88 тысячы рублёў, альбо 855,3 долара ЗША зберажэнняў у банкаўскіх укладах і сертыфікатах прыходзіцца на аднаго жыхара рэспублікі.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Жураловіч, летась рублёвыя і ўклады ў замежнай валюце ў беларускіх банках павялічыліся больш як на 4,8 трыльёна рублёў, або на 26,5 працэнта. Такім чынам, на пачатак студзеня гэтага года яны дасягнулі амаль 23 трыльёнаў рублёў. Калі ж «падбіваць» усе сродкі, прыцягнутыя банкамі, у тым ліку і нерэзідэнтаў ад размяшчэння ашчадных сертыфікатаў і аблігацый, то гэты паказчык склаў 24,3 трыльёна рублёў (рост 5,6 трыльёна рублёў). За мінулы год дэпазіты ў нацыянальнай валюце ўзраслі з 8 трыльёнаў рублёў да 9,8 трыльёна, а ў замежнай валюце — з 3,5 мільярда долараў ЗША да амаль 4,4 мільярда долараў у эквіваленце.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Кожны пяты пенсіянер прадаўжае працаваць

**Пра гэта паведаміла БЕЛТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса Яшкова.**

Паводле статыстыкі, на 1 студзеня гэтага года агульная колькасць атрымальнікаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне дасягнула 2 млн 468,9 тыс. чалавек. З іх амаль 608,5 тыс. прадаўжаюць працоўную дзейнасць. Удзельная вага працоўных пенсіянераў пастаянна павялічваецца, адзначыла Ларыса Яшкова. Лічацца на рабочых месцах 396,3 тыс. жанчын і 212,2 тыс. мужчын. Прадаўжаюць працаваць 59,9 тыс. жанчын і 33,1 тыс. мужчын ва ўзросце да 55 гадоў, 184,5 тыс. жанчын і 33,3 тыс. мужчын ва ўзросце 55—59 гадоў. Ва ўзроставай катэгорыі атрымальнікаў пенсій 60—64 гады працоўных жанчын — 91,5 тыс., мужчын — 91,4 тыс. Прадаўжаюць працаваць 33,9 тыс. жанчын і 27,5 тыс. мужчын ва ўзросце 65—69 гадоў. У ліку працоўных пенсіянераў — 24,6 тыс. жанчын і 24,1 тыс. мужчын ва ўзросце 70—79 гадоў, а таксама 1120 жанчын і 1036 мужчын ва ўзросце 80—89 гадоў. Што самае дзіўнае: лічацца працоўнымі 8 жанчын і 9 мужчын, якія перасягнулі 90-гадовы рубеж. А вось сярод стагадовых беларусаў афіцыйна працоўных няма (усяго ж у рэспубліцы 579 пенсіянераў ужо адзначылі свой векавы юбілей).

## Сабака — прычына канфлікту?

**Ну і ну!**

**САБАКА чамусьці не спадабаўся пасажырам аўтобуса, які ажыццяўляў міжнародны рэйс. Аўтобус накіроўваўся з расійскага горада Вялікія Лукі ў беларускі Віцебск. У салоне ўзнік канфлікт, адбылася бойка. У канфліктуючых бакоў былі дзве супрацьлеглыя версіі. Хто мае рацыю — не без цяжкасцяў разабраліся падчас следства.**

Як расказала «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына ТАЎТЫН**, усё распачыналася прыкладна так. У гарадку Вялікія Лукі ў рэйсавы аўтобус селі два хлопцы і жонка аднаго з іх. Пілі па дарозе піва, паводзілі сябе, так бы мовіць, не па-джэнтльменску. На адным з наступных прыпынкаў у аўтобус зайшлі яшчэ пасажыры — пара з сабакам. Аўчарка, як потым растлумачыла тройца, пачала нюхаць багаж, і быццам бы спрабавала нават пакусаць аднаго з хлопцаў. У выніку спачатку пабілі гаспадара сабакі, потым дасталося і ягонай жонцы, якая заступілася за мужа. У Гарадку выклікалі міліцыю. Пачалі разбірацца. Пацярпелыя расказвалі адно, хуліганы зусім іншае. Падчас следства высветлілі, хто вінаваты.

Аднаго з хуліганаў прыгаварылі да абмежавання волі тэрмінам на год, другога — на год і шэсць месяцаў. Іх таксама абавязалі кампенсаваць пацярпелым маральныя страты — паўмільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Абзац

▲ У Мінску пенсіянерка загінула пры пажары ва ўласнай кватэры. Узгаранне адбылося ўвечары ў адным з дамоў па вул. Гікала. Падчас тушэння пажару знайшлі труп гаспадыні — жанчыны 1937 г.н. Прычына ўстанаўліваецца.

**▲ У прыватным доме ў Пінску выбухнуў ацяпляльны кацёл на цвёрдым паліве. Выбухнула ў летняй кухні. На шчасце, людзі не пацярпелі. Мяркуемыя прычыны НЗ — адсутнасць цыркуляцыі вады ў сістэме і непаладка клапана.**

▲ Два выпадкі захворвання на батулізм у цяжкай форме зарэгістраваныя ў Віцебскім раёне. Па медыцынскую дапамогу звярнуліся жыхары вёскі Камунарка. Яны былі адразу ж шпіталізаваныя з дыягназам батулізм і праходзяць курс тэрапіі ва ўмовах стацыянара. Як устаноўлена, пацярпелыя (маці і сын) працяглы час ужывалі кансерваваныя грыбы ўласнага прыгатавання.

## Поўны абзац

**▲ У Цярнопалі жанчына ўкусіла інспектара ДАІ за руку. Нарад ДПС спыніў аўтамабіль «Мазда», на лабавым шкле якога адсутнічаў талон аб праходжанні тэхагляду. Пры размове з інспектарам кіроўца заўважна нерваваўся. У хуткім часе прычына нервавання высветлілася — кіроўца быў нецвярозы. У дачыненні да яго быў складзены пратакол па двух артыкулах аб парушэннях, а аўтамабіль дастаўлены на штрафстаянку. Між тым, падчас апісання аўто з'явілася жанчына. Нічога не тлумачачы, яна села ў машыну і паспрабавала ў ёй зачыніцца. Адзін з інспектараў, каб не дапусціць блакіравання дзвярэй, прасунуў руку ў салон аўтамабіля. У гэты час жанчына зацiснула руку правааахоўніка дзверцамі і двойчы ўкусіла яе (руку). Прычыны дзіўных паводзін жанчыны, якая апынулася гаспадыняй аўто, устанаўліваюцца пракуратурай.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ШТО МАЕМ, НЕ ХАВАЕМ

Падставай для завядзення крымінальных спраў супраць двух маладых жыхароў Гомеля стаў той факт, што яны захоўвалі на жорстких магнітных дысках персанальных камп'ютараў па месцы свайго жыхарства файлы, якія экспертызай прызнаныя парнаграфічнымі. Справа ў тым, што для карыстальнікаў адной з лакальных камп'ютарных тэлевізійных сетак у Гомелі файлы былі адкрыты ў рэжыме агульнага доступу. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, у кожнага з грамадзян спецыялісты знайшлі яшчэ і «відэахлубнічку» з удзелам непаўналетніх.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»**
извещает своих акционеров,
что 4-ая выплата дивидендов по итогам
финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год
будет осуществляться по адресу:
г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.
**Справки по тел. (017) 334 30 31, 334 34 74.**
УНП 100364117

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## УНІВЕРСАЛЬНАЯ КАРТА СТАНЕ ГАЛОЎНЫМ ДАКУМЕНТАМ РАСІЯН



**Апублікаваны праект маленка Універсальнай электроннай карты — пластыкавай карткі, якая, як плануецца, ужо з 2012 года павінна стаць галоўным дакументам грамадзяніна Расіі.**

Яна будзе выконваць аднача сова функцыі пасведчання асобы, банкаўскай карты, залікова кніжкі для студэнтаў, праязнога на грамадскім транспарце, поліса розных відаў страхавання і г.д.

## ТУНІС: НАПРУЖАННЕ НАРАСТАЕ

**Хваля беспарадкаў у Тунісе дакацілася да турыстычных цэнтраў — МЗС шэрагу еўрапейскіх краін і ЗША заклікаюць грамадзян часова адмовіцца ад паездак у гэту афрыканскую краіну, а тураператары эвакуюць сваіх кліентаў. Тым часам расійскія ўлады папярэдзілі пра небяспеку паездак у Туніс, але вывозіць нікога не збіраюцца.**

Напярэдадні беспарадкі адбыліся ў вядомым турыстычным цэнтры — Хамамеце. Групы людзей атакавалі, разрабавалі і падпалілі супермаркет у Старым горадзе. Зачыненыя крамы, кавярні і рэстараны. Да поўначы напружанае становішча склалася ў Ла Марсе і Сідзі-Бу-Саідзе — знакамітых курортах, дзе пражывае шмат еўрапейцаў. «Я стаў сведкам эпізодаў паўстанцкай барацьбы... Яны рабавалі, падпальвалі будынкі мясцовай паліцыі», — цытуе InoPressa словы італьянца, які вярнуўся з Бізерты. Учора ўвечары ўлады ўвялі ў краіне рэжым надзвычайнага становішча.

## ПАД МАСКВОЙ ВЫКРАЛІ АЙВАЗОЎСКАГА І РЭПІНА

**Група невядомых уварвалася ў падмаскоўны дом буйнога прадпрымальніка Аляксандра Таранцава і выкрала адтуль прыватную калекцыю шэдэўраў рускага жывапісу.**

З ліку выкрадзеных палотнаў былі працы Айвазоўскага, Шышкіна і Рэпіна. Па папярэдніх звестках, кошт выкрадзеных карцін можа дасягаць некалькіх мільёнаў долараў.

## ЯПОНЦЫ ВЕРНУЦЬ МАМАНТАЎ?



**Японскія навукоўцы зноў хочуць вярнуцца да ідэі адрадзіць даўно вымерлых мамантаў.**

Пасля новых адкрыццяў у сферы генетыкі яны спадзяюцца нарэшце давесці задуманае да канца. Адраджэнне вымерлых жывёл шляхам кланавання — даволі старая ідэя, якая існуе ўжо не адзін дзясятак гадоў. Прафесар універсітэта Кіёта Акіра Ірытані настроены сур'ёзна і ўжо сёлета плануе адправіцца ў Сібір на пошукі падыходзячых туш. У выпадку поспеху Ірытані плануе атрымаць жывога маманта ўжо праз чатыры гады, ужываўшы атрыманыя клеткі афрыканскай слаНісе.

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.01.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ■ 1 долар ЗША | 3 010,00 | 1 чэшская крона | 165,31 |
| ▲ 1 еўра | 4 045,44 | 1 польскі злоты | 1 039,44 |
| 1 латвійскі лат | 5 748,66 | ▲ 1 расійскі рубель | 100,49 |
| 1 літоўскі літ | 1 167,89 | 1 украінская грыўня | 378,38 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 29,9540 |
| 10 UAH | 37,6543 |
| 1000 BYR | 9,9482 |
| EUR | 40,1264 |

Камандзіроўка па званку

# Хто і чаму хоча «добрага гаспадара са свету згладзіць»?

## ...ВЫСВЯТЛЯЛА КАРЭСПАНДЭНТ «ЗВЯЗДЫ»

Надзея ДРЫЛА

**Пасля выхаду 11 студзеня публікацыі «За што фермеры прапаноўваюць прыцягваць да адказнасці мясцовых чыноўнікаў?» у рэдакцыю патэлефанавала Тэрэса Чуйко са Стаўбцоўскага раёна. Галоўны спецыяліст па ахове працы і тэхнікі бяспекі заўзята абараняла свайго начальніка — дырэктара ТАА «СЖК «Налібакі» Юрыя Касценку. Маўляў, «такога добрага кіраўніка, як Юрый Мікалаевіч, яшчэ пашукаць трэба. А новыя мясцовыя ўлады, замест таго, каб падтрымліваць і дапамагаць яму, хочуць гэтага гаспадара са свету згладзіць, каб яго не было, бо ён лепшы за ўсіх. Ужо куды мы толькі не звярталіся, а ў адказ прыходзяць толькі адпіскі. Адна надзея на вас. Прыедзьце, выслухайце нас і напішыце праўду».**

**На наступны дзень я трымала курс на Стаўбцоўшчыну. Першай справай сустрэлася з дырэктарам «унікальнага прадпрыемства з унікальнымі праблемамі» (прынамсі так ён пра сябе сёння гаворыць).**

### «Проста хочацца, каб пакінулі ў спакоі і далі нармальна працаваць»

***— Юрый Мікалаевіч, раскажыце, хто і якім чынам перашкаджае вам працаваць?***

— У 2005 годзе ранейшы старшыня райвыканкама ўгаварыў мяне ўзяць пад сваё крыло суседнюю гіблую гаспадарку «Хотава». А паколькі зямлю нам і на той час не надта давалі, то я згадзіўся. Але пры ўмове, што калгас пяройдзе мне ў прыватную ўласнасць. На той момант, паколькі калгас, можна сказаць, дажываў свае дні, усіх задавальняла. Больш за чатыры гады мы працавалі, стараліся, укладалі туды ўсю душу, уласныя сродкі. І вось у адзін цудоўны дзень новая мясцовая ўлада выгнала нас з «Хотава». Сказалі, што будуць падымаць на ногі гаспадарку ўласнымі сіламі. І што вы думаеце? Зараз тыя землі, якія ў нас адабралі, рэальна не апрацоўваюцца і не ўбіраюцца як след. А пра тое, якая там сёння вытворчасць, я наогул маўчу...

***— А зямлю ўзамен вам далі ці не?***

— Так, маю заяву аб выдзяленні зямлі задаволілі. Часткова абяцаныя гектары (дарэчы, самыя непрыдатныя) атрымаў, але ўжо паўгода не магу дабіцца, каб мне афармілі дагавор арэнды. Вусна сказалі: «Ты працуй, не перажывай, узаконім мы тваю зямлю». Але як я магу быць упэўнены ў тым, што чыноўнікі, як і летась, не прыйдуць і не забароняць мне на ёй працаваць. І мне зноў давядзецца стаяць вясной пасярод дарогі і думаць, чым я заўтра буду карміць жывёлу...



**«Проста хочацца, каб пакінулі ў спакоі і далі нармальна працаваць», — кажа дырэктар ТАА «СЖК «Налібакі».**

***— Што вы зараз чакаеце ад мясцовых уладаў?***

— Пасля прыходу новага кіраўніцтва я не атрымаў ад раёна ніводнага літра саляркі, ніводнага кілаграма ўгнаення, нічога... Ніякай дапамогі і цяпер не прашу. Адзінае: няхай афармяць мне дакументы на выдзеленую рашэннем райвыканкама зямлю. Я не прашу нічога лішняга. Проста хочацца, каб пакінулі мяне ў спакоі і далі нармальна працаваць. А ставяць нам палкі ў колы выключна таму, што асабіста я не задавальняю мясцовую ўладу. Іншых прычын я не бачу. Вось толькі ніяк не магу ўцяміць, чаму. Гаспадарка, якую я ўзначальваю ўжо 15 гадоў, адна з самых эфектыўных у нас у раёне. Летась мы атрымалі каля 3 млрд прыбытку. Прадаём больш за 6 тысяч тон малака і каля паўтары тысячы тон мяса на дзяржаўныя заводы. Нашы работнікі атрымліваюць годную зарплату. Тут уся прычына, як я бачу, у асабістых амбіцыях старшыні райвыканкама. Але якая розніца, добры я ці дрэнны — прадпрыемства ж працуе рэнтабельна.

### «Няхай выкупляюць ферму, альбо мы будзем вымушаны яе разбіраць»

— На месцы гэтай сучаснай фермы былі толькі голыя сцены, — паказвае і расказвае па прыездзе ў Ніўнае **намеснік дырэктара па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі СЖК «Налібакі» Аляксандр КІСЦЕНЬ**. — Мы правялі рэканструкцыю сваімі сіламі. Менавіта таму яна нам абышлася менш чым у мільярд беларускіх рублёў. Зараз прапаноўваем новаму старшыні СВК «Хотава» вярнуць грошы, якія мы ўклалі ў рэканструкцыю гэтай фермы. Гэта будзе выгадна не толькі нам, але і СВК «Хотава», бо кошт, які мы просім, вельмі адрозніваецца ад рынкавага.

— Юрый Мікалаевіч сказаў, што калі яе не згодзяцца выкупіць, — уступае ў размову **Тэрэса ЧУЙКО**, — то нам нічога не застанецца, як ламаць яе. Калі я гэта пачула, дык два дні не спала. Ён жа там сваё здароўе паклаў... Ведаеце, у 2005 годзе, калі СВК «Хотава» перадалі Юрыю Мікалаевічу, гэта гаспадарка ўжо аджывала. Я ўжо не верыла, што нешта тут будзе. Але, як убачыла, што гэты чалавек абуў боты і працаваў суткамі на комплексе разам з простымі работнікамі, паверыла. За пяць гадоў Юрый Мікалаевіч дабіўся рэкорднага для СВК «Хотава» ўраджаю. І вось у адзін цудоўны дзень улады прыйшлі і ўсё адабралі ў яго. Новы старшыня за год усё давёў тут зноў «да ручкі». Людзі ж не сляпыя, усё бачаць.

* * *



**«Нам зараз добра працуецца, не скардзімся. І зарплата ў нас добрая. Мы хочам толькі аднаго: каб нам далі спакойна працаваць і плацілі годную зарплату», — пагадзіліся з загадчыцай фермы і іншыя работніцы СЖК «Налібакі», з якімі мне давялося сустрэцца побач з новай фермай. І ў СВК «Хотава», як я зразумела, пераходзіць яны не гараць жаданнем.**

### А вось што кажуць мясцовыя жыхары

**ШУМЧЫК Аліна Карлаўна, загадчыца малочнатаварнага комплексу СЖК «Налібакі»:**

### «Хочам зарабляць грошы і каб нам ніхто галаву не дурыў»

— Амаль год мы працуем у падвешаным стане. Комплекс, які ў нас забралі, мы пакуль не можам вызваліць, бо няма куды ставіць кароў. У нас забралі зямлю, таму жыжу возім за 7-8 кіламетраў. Юрый Мікалаевіч Касценка нам заўсёды казаў, што без працы нас не пакіне. Забярэ ў Налібакі. Але ж самі падумайце, які мне рэзон штодзень ездзіць з Ніўнага за 15 кіламетраў на працу. Хто ж будзе маю кароўку ў абед даіць? У мяне няма каму. Не ведаю, што далей будзе. Ісці ў СВК «Хотава» рабіць на дадзены момант, шчыра скажу, няма жадання. Ведаю, якая абстаноўка ў гаспадарцы. Тут нічога добрага няма. Ды і не прапаноўваў нам ніхто. Мы, рабочыя людзі, проста хочам рабіць, зарабляць грошы, каб ніхто галавы нам не дурыў. Пры цяперашнім дырэктары СЖК «Налібакі» я сплю спакойна, бо ведаю, што ранкам прыйду, а ў мяне ёсць кармы, людзі, зарплата. Некалі ж зарплаты чакалі і месяц, і два, як прыходзілася. Было абы-што. А цяпер зарплату плацяць своечасова. Ёсць, безумоўна, праблемы і сёння, але не такія істотныя. Самі ж ведаеце, усё пазнаецца ў параўнанні.

**Стараста вёскі Ніўнае**:

### «Былы старшыня не лічыўся ні з інвалідам, ні з пенсіянерам»

— Я двойчы мела справу з Касценкам. Неяк раз прыйшлося выпісаць тату (ён у мяне ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, інвалід 1 групы) зерне ў СВК. Касценка выпісаў, як камерсант, — па 600 рублёў за кілаграм. Мы тады здзівіліся: гэта ж нерэальная цана. Другі раз я папрасіла ў яго шэсць сотак зямлі для таты, што пуставала ля клуба. Ён жа сказаў, што яму «ўсё адно — ці ўдзельнік вайны, ці пенсіянер». І не даў... Толькі самы першы год, як пачаў працаваць, адзін раз даў тату трактар бясплатна, каб дровы прывезці. А пасля ўсім даваў, але па камерцыйным кошце. На сходзе зала была бітком набітая, і ўсе прагаласавалі за новага старшыню, за Сяліцкага. Касценка пастаяў трохі, развярнуўся і рэзка сышоў. Ён зразумеў, што за яго ніхто.

**ТАЛЕЙКА Яніна Міхайлаўна, палявод СВК «Хотава»:**

### «І пры Касценку было нармальна. Толькі што ён паразбурваў усё тут скрозь»

— Пры мне мянялася шмат кіраўнікоў. Для мяне ўсе добрыя. І пры Касценку было нармальна. Толькі што ён паразбурваў усё тут скрозь. У Хотаве стайня была ды свінарнік добры, у вёсцы Лубень — ферма. Навошта гэта было раскідваць. Во цяпер бы нам спатрэбіліся тыя будынкі. Мы тады гэтак абураліся ўсе. Але хто нас слухаў, простых рабочых. Казалі, што ў Касценкі шмат было знаёмства ўсякага. На сходзе, калі выбіралі старшыню, кожны сваё меркаванне не казаў. Глядзелі адзін на аднаго і падымалі рукі. Усе прагаласавалі за Сяліцкага. Наш цяперашні старшыня неблагі чалавек. А што ж, калі ў нас ферму гэту падзяліць ніяк не могуць. Можа ж ужо комплекс і аддадуць, ды раён дапаможа, дык пойдзе што. А Бог яго ведае. І пры Касценку было ўсякага таксама. Рабіць рабіў жа ж. Быццам бы ў яго больш тэхнікі было, больш грошай, дык больш нешта і рабілася. А вось што пенсіянераў закінуў, дык гэта праўда. Не дапамагаў ім зусім. Дык на сходзе пенсіянеры на яго ўсяк казалі. Зарплата ў мяне нядрэнная і цяперака. Не ніжэй, чым пры Касценку. А як яно лепей, хто ведае? Пры Касценку ж не папытаешся нічога. Ён наогул з рабочымі мала размаўляў. Ён людзей не лічыў за людзей, прынамсі так людзі паміж сабой казалі.

* * *

**По каментар я звярнулася да старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Уладзіміра МІСЬКО:**

### «У рэшце рэшт маё цярпенне лопнула»

— Якія ў гэтай сітуацыі могуць быць амбіцыі, калі супраць яго прагаласавала 200 чалавек? Якія асабістыя амбіцыі, калі я з чалавекам сустракаўся не адзін раз і прапаноўваў яму



Фота БЕЛТА.

**— Якія ў гэтай сітуацыі могуць быць амбіцыі, калі супраць яго прагаласавала 200 чалавек? — здзіўляецца старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама.**

як мінімум 6 варыянтаў, каб узаконіць карыстанне землямі СВК «Хотава» (рэч у тым, што ў 2005 годзе, калі далучалі СВК «Хотава» да СЖК «Налібакі», была ідэя зрабіць унітарнае прадпрыемства, але дакументальна ніхто справу да канца не давёў). Але за 3,5 года, што я тут працую, ён так ні на адным з іх не спыніўся. Маўляў, «я падумаю». Безумоўна, навошта яму арандаваць альбо выкупляць гаспадарку, калі можна карыстацца зямлёй і будынкамі бясплатна, можна вырошчваць збожжа на хатавіцкіх палях і забіраць яго ў Налібакі па сабекошце. Гэта ж незаконна. У рэшце рэшт маё цярпенне лопнула. Больш за тое (пэўна, ён вам пра гэта не расказаў), за 2007 год яму асабіста было выплачана 350 млн дывідэндаў ТАА «СЖК «Налібакі». Чаму ж ён не падзяліўся з людзьмі, якія ў яго працуюць? Да мяне гэтая папера трапіла выпадкова. Гэта правільна так сёння? Таму не такі ён пушысты, якім хоча здавацца.

СВК «Хотава» мы сёння аднавілі. Комплекс адсудзілі: дагавор арэнды абласны гаспадарчы суд прызнаў несапраўдным. Я, дарэчы, прапаноўваў яму тую новую ферму, якую яны пабудавалі самавольна, забраць у арэнду. Дык не згадзіўся. А зараз плача, што яму скаціну няма куды ставіць. А разбураць і ламаць ніхто яму нічога не дазволіць, ён проста не мае на гэта права. Гэты будынак знаходзіцца на балансе СВК «Хотава». Усім людзям, гэта я абяцаю, якія пакуль што працуюць на комплексе ў Ніўным, мы дадзім працу і годную зарплату.

Мне сюды тэлефанавалі пенсіянеры з «Хотава», якія ўсё жыццё прапрацавалі ў той гаспадарцы. Скардзіліся, што Касценка ім ні сена, ні саломы не даваў.

І ўсё лепшае ён забіраў у Налібакі. Пакінуў тут толькі адзін дойны статак у 400 галоў на цэнтральнай ферме. Тэхніку новаму старшыні давялося практычна ўсю браць у лізінг, бо нічога не засталося. Гэта нармальна?

Што тычыцца зямлі, то мы, як і абяцалі (а дамаўляліся на 1300 гектараў), выдзелілі яму ўжо большую частку. Засталося 267 гектараў. Да вясны ён іх атрымае. І няхай афармляе. Што я яму буду яе афармляць? Рашэнне выканкама ёсць, павінен ісці ў землеўпарадкавальную службу і разбірацца з гэтымі пытаннямі.

***— Уладзімір Трафімавіч, а гэта праўда, што вы плануеце спадара Касценку звольніць у бліжэйшы час? Прынамсі, ён, як я зразумела падчас размовы з ім, у тым, што яму не дадуць працаваць, пераканаы.***

— Мы да гэтага не маем ніякага дачынення. Гэта можа вырашыць толькі агульны сход акцыянераў ТАА «СЖК «Налібакі».

* * *

***Самае цікавае, што і адзін бок, і другі настойліва прасіў мяне аб адным: «Напішыце толькі праўду». Вось толькі праўда, як высветлілася, у кожнага свая...***

**Фота аўтара.**

*Стаўбцоўскі раён.*

# Пастаўкі малака і малочнай прадукцыі ў гандлёвую сетку Мінска застануцца стабільнымі

**Пра гэта паведаміў БЕЛТА выконваючы абавязкі начальніка галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксей Раманаў.**

Каментуючы сітуацыю апошніх дзён, калі ў вячэрні час у некаторых магазінах Мінска цяжка стала купіць пастэрызаванае малако, Аляксей Раманаў адзначыў, што ў цэлым перабояў у яго рэалізацыі не назіраецца. Паводле яго слоў, пастаўляемы гармалзаводам № 1 малочны напітак — гэта тое ж малако, толькі аднаўленае з натуральнага, якое штогод вырабляецца ў зімовы перыяд.

Разам з пастаўкай малака ад мінскіх заводаў забеспячэнне рынку сталіцы гэтай прадукцыяй ажыццяўляецца і за кошт іншых перапрацоўчых прадпрыемстваў краіны (іх у Беларусі больш за 50), дэфіцыту малака няма. Што датычыцца асартыменту, то ён крыху звузіўся, але ўсё роўна ў магазінах горада заўсёды можна купіць малако рознай тлустасці і віду.

Тым не менш, зыходзячы з аналізу сітуацыі па некаторых магазінах Мінска, праблема з забеспячэннем малаком гандлёвай сеткі сталіцы ёсць. Напрыклад, ва ўніверсаме «Валгаград» таваразнаўцы пацвердзілі, што заяўкі магазіна выконваюцца не ў поўным аб'ёме, асабліва ёсць прэтэнзіі да гармалзавода № 1. «Спрабуем выходзіць са становішча і больш заказваць малака ад іншых пастаўшчыкоў», — сказалі таваразнаўцы.

Ва ўніверсаме «Заходні» расказалі, што малако хутка разбіраюць, і да вечара застаецца толькі малочны напітак, той самы, што вырабляецца з аднаўленага малака. Ён прадаецца па цане Br2,5 тыс., што для радавых пакупнікоў дорага, пенсіянеры яго нярэдка вяртаюць пры разліку на касе. Недастатковыя пастаўкі малака ад сталічных малочных заводаў адзначылі і ў іншых гандлёвых кропках.

Раней мінскія прадпрыемствы экспартавалі прадукцыю па астаткавым прынцыпе: у першую чаргу ажыццяўлялі пастаўкі на ўнутраны рынак, а што застанецца — на экспарт. Цяпер сітуацыя крыху змянілася — малочным заводам у 2011 годзе даведзены больш высокія прагнозныя паказчыкі па экспарце ў параўнанні з 2010 годам (тэмп росту 160 працэнтаў у цэлым па годзе).

Сітуацыя з нехваткай на рынку малочнай прадукцыі ў студзені ўвогуле не новая. Яна перыядычна ўзнікае ў пачатку года, таму што гэта звязана з пастаўкамі сыравіны на перапрацоўчыя прадпрыемствы. У гаспадарках у гэты перыяд ідзе масавы ацёл і некаторыя каровы з дойнага статка часова «адпачываюць».

Тым не менш у аддзеле жывёлагадоўлі Мінсельгасхарча адзначылі, што зніжэння валавой вытворчасці малака ў студзені не назіраецца. У міністэрстве лічаць, што сыравіны дастаткова, каб выпускаць любую натуральнамалочную прадукцыю і рознай тлустасці. У Мінгандлі адзначылі, што ў цэлым па рэспубліцы растуць аб'ёмы продажаў натуральнамалочнай прадукцыі. Штомесяц на ўнутраны рынак пастаўляецца каля 100 тыс. тон такой прадукцыі. Па выніках 2010 года дасягнуты рост у параўнанні з 2009 годам на 4 працэнты.

## У Беларусі даўжнікоў па аліментах не будуць пускаць у казіно і залы гульнявых аўтаматаў

Укараненне праграмы абароны гульца і яго сям'і ў беларускіх гульнявых установах можа даць магчымасць абмежаваць доступ да гульні ў выпадку адначасовага вялікага пройгрышу, сістэматычнага пройгрышу гульца, наяўнасці ў гульца абавязацельстваў і абцяжаранняў у выглядзе нявыплачанага крэдыту, запазычанасцяў па выплаце аліментаў, іншых запазычанасцяў. Аб гэтым гаворыцца ў Канцэпцыі развіцця гульнявога бізнэсу ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанай 12 студзеня гэтага года пастановай Савета Міністраў № 31, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна. Абарону гульца можна забяспечыць, укараніўшы адзіную сістэму кантролю па ўсёй краіне. «У процілеглым выпадку гульцу для працягу некантралюемай гульні дастаткова проста знайсці залу гульнявых аўтаматаў, якая належыць іншаму ўласніку», — лічаць аўтары канцэпцыі.

# Драматургі і сцэнарысты, вас будуць шукаць!

## альбо Чаму не купляюць беларускага сыру?

**Супольны праект Міністэрства культуры і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага «Новы погляд», які зараз знаходзіцца на стадыі распрацоўкі, будзе прысвечаны пошуку і прасоўванню маладых беларускіх драматургаў і кінасцэнарыстаў.**

— Калі раней Міністэрства культуры час ад часу праводзіла нейкія конкурсы — людзі проста прысылалі п'есы, нейкае журы іх праглядала, вылучала пераможцам пэўную колькасць базавых велічынь, дыплом — і да пабачэння, — **распавядае беларускі драматург і кінасцэнарыст Андрэй КУРЭЙЧЫК,** — то цяпер мы з Сяргеем Кавальчыкам, галоўным рэжысёрам Нацыянальнага тэатра імя Горкага, прапанавалі паспрабаваць пастаянна шукаць таленавітых драматургаў яшчэ на ўзроўні школы і ўніверсітэта. Мы хочам прыцягнуць Міністэрства адукацыі з усёй яго гіганцкай сістэмай навучальных установ; усе школы Беларусі, уключаючы рэгіянальныя, там, дзе наогул людзі, можа, у тэатр не хадзілі ніколі, але там, у глыбінцы, самыя таленты і хаваюцца — як Быкаў і Адамовіч. Мы лічым, што адзіныя людзі, якія насамрэч ведаюць — таленавіты чалавек альбо не — гэта настаўнікі і выкладчыкі, перш за ўсё, літаратуры. Мы хочам з іх дапамогай знайсці таленты, прывесці іх у Мінск на базу Нацыянальнага тэатра імя Горкага, правесці з імі вялікую адукацыйную праграму, прыцягнуць іх да прафесіі, папрацаваць над іх п'есамі. Даць ім зразумець, што гэта за прафесія такая — драматург. У нас няма рынку драматургіі, таму таленавітыя людзі, мала ўяўляючы сабе розныя тэхнічныя нюансы драматургічнага майстэрства, закопваюць свой талент і выбіраюць іншую прафесію, якая больш навідавоку. Тым удзельнікам конкурсу, хто насамрэч захоча займацца гэтай прафесіяй, мы будзем імкнуцца дапамагчы паступіць на профільныя спецыяльнасці па кіна- і тэатральнай драматургіі ў вядучыя ВНУ. Хочам зацікавіць Прэзідэнцкі фонд па падтрымцы таленавітай моладзі падтрымаць гэтых людзей з тым, каб яны засталіся ў прафесіі. Праект «Новы погляд» мы разлічваем на людзей ад 15 да 30 гадоў. Спадзяюся, што мы яго рэалізуем, тым больш, што пацвярджэнне аб падтрымцы з Міністэрства культуры ў нас ужо ёсць: **першы намеснік міністра культуры Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ** даслаў ліст са сваім подпісам. У пісьме ён запэўніў, што Мінкульт лічыць магчымым правядзенне конкурсу драматургаў на базе тэатра імя Горкага і са свайго боку гатовы пачаць распрацоўку адпаведных дакументаў пры рэалізацыі вышэйназванага праекта ў 2011 годзе з магчымым прыцягненнем да ўдзелу Міністэрства адукацыі, Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай акадэміі мастацтваў і іншых устаноў адукацыі і культуры.

Гэты конкурс — наша вялікая надзея, бо мы разумеем, што і кіно, і тэатр пачынаюцца з літаратурнага матэрыялу. І толькі даўшы дарогу маладым талентам, мы можам падняць з кален наша мастацтва.

Рэалізацыя праекта «Новы погляд» і прыток новых драматургаў дапаможа, дарэчы, змагацца з пірацтвам у беларускіх тэатрах. У гэтым таксама перакананы Андрэй Курэйчык:

— Гэта страшная рэч, яна ўжо 20 гадоў з'яўляецца гэткай пухлінай на целе бадай усіх беларускіх тэатраў, калі п'есы замежных аўтараў ставяцца без усялякіх дазволаў і ганарараў, бясплатна. І, відома ж, у гэтых умовах ніхто не хоча ставіць беларускія п'есы. Тут ёсць і пытанне якасці, але, тым не менш, калі французскі сыр бясплатны, то беларускі за грошы ніхто ніколі купляць не будзе. Пірацтва, якое квітнее амаль ва ўсіх рэгіянальных тэатрах і некаторых мінскіх, палохае. Беларускія драматургі напісалі ліст міністру культуры Паўлу Латушку і атрымалі адказ. Гэты адказ нас вельмі ўзрадаваў. У ліст мы склалі спіс усіх тэатраў, дзе ідуць пірацкія пастаноўкі, і Мінкульт на іх у гэтым сэнсе паўздзейнічаў. Павел Латушка ў афіцыйным адказе напісаў, што гэтая практыка будзе спынена, што ўсе тэатры прымусяць атрымліваць дазвол у аўтараў. Насамрэч, гэта вельмі сур'ёзна, таму што ў тэатрах такіх «пірацкіх пастановак» — больш за палову рэпертуару. Але гэта неабходныя змены, бо інакш атрымліваецца, што тэатры проста парушаюць заканадаўства. Адначасова, гэта надзея для беларускіх драматургаў пабачыць свае п'есы на роднай сцэне. Але, заўважце, мы не просім ніякіх прэферэнцый, каб было, напрыклад, 75% беларускай драматургіі ў тэатрах; мы не просім большых, чым у некага, ганарараў. Мы просім проста спыніць пірацтва на дзяржаўнай сцэне.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**



Віншуем!

# Балады ад Янкі

**Балады пра славянскае вальнадумства прынеслі Янку Сіпакову галоўную ўзнагароду ў часы БССР**

**Дзяржаўнай прэміяй рэспублікі ён быў адзначаны ў 1976-м годзе за кнігу «Веча славянскіх балад». І сёння, калі пачытаць гэтыя балады, то можа падацца дзіўным, што ў заідэалагізаваныя часы паэта адзначылі за балады розных славянскіх народаў, якія расказвалі пра нацыянальную годнасць, любоў да свайго краю, яго гісторыі, мовы, культуры, пра ўласцівае славянскай душы вальналюбства і прагу самім вырашаць свой лёс. З часоў старажытнай гісторыі вядома, як ў цяжкія часы людзі збіраліся на веча — каб прыслухаліся да іх голасу. Народнае веча вырашала лёс гісторыі і рухала яе. Не дзіўна, што гэты цыкл напісаў паэт, які родам з Аршаншчыны, — зямляк Караткевіча. Напэўна, багатая гісторыя гэтага горада надзяляе творцаў, якія тут нараджаюцца, здольнасцю пранікаць праз межы часу. Зрэшты, як і перамагаць яго. Таму што творы Янкі Сіпакова не згубілі сваёй актуальнасці: гэта нібыта пра нас. А зрэшты — і сапраўды пра нас і для нас, жыхароў Беларусі, сказана. Але вось толькі ці добра мы самі сябе ведаем? Паэт, пісьменнік — як псіхолаг: адчувае тое, у чым чалавек часам баіцца сабе прызнацца. А потым пакрысе выпускае на волю ў зборніках вершаў — навучыўшы, напрыклад, глядзець «Вочы ў вочы» ды гаварыць: «Усміхніся мне». Ці тлумачыць, як у некаторых кніжках прозы, што «Усе мы з хат», маем «Спадзяванне на радасць», але разумеем, што бывае «Журба ў стылі рэтра»... Лёс чалавеку падкідвае розныя пачуцці, па-свойму загартоўвае. Ці то праз страты, якія немагчыма ніколі аднавіць (Янка Сіпакоў страціў бацькоў падчас вайны, яго гадавала цётка). Але ўменне пераждаць выпрабаванні бывае ўзнагароджана — нададзенымі здольнасцямі і магчымасцю праявіць іх у пэўны момант. Пра гэтыя моманты пісьменнік, напэўна, узгадае сёння, у дзень свайго 75-гадовага юбілею. І распавядае нашым чытачам пра адзін з эпізодаў, якія прывялі яго ў літаратуру.**



Янка СІПАКОЎ

*З кнігі «Мая бібліятэка»*

# ВЕЛЬМІ ШАНОЎНЫ СКАРБ

За ўсё сваё жыццё я не сабраў сабе аніякіх скарбаў — ні золата, ні брыльянтаў, ні нават самых звычайных, пакамечаных і зашмальцаваных у шматлікіх кішэнях, паперовак.

І ўсё ж адна вельмі вялікая каштоўнасць, найдаражэйшы мой скарб, у мяне ёсць. Я кажу пра маю хатнюю бібліятэку. Усё маё багацце — яна, яна, яна...

І, вядома ж, яны — кнігі.

Кнігі былі маімі сябрамі. І іх было ў мяне шмат. Часта я вітаўся з імі: «Добрай раніцы!» і, стомлены за дзень, жадаў ім: «Дабранач». Сваёй бібліятэцы я, можна сказаць, аддаў усё сваё жыццё. Здаецца, я амаль ніводнага дня не прыходзіў дадому без кнігі. А здаралася, што вяртаўся і з двума важкімі пакункамі ў абедзвюх руках.

Кнігалюбы лічылі маю бібліятэку адной з лепшых у Мінску. Я ж так не лічыў. Бо ведаў сапраўдных асаў «палявання на кнігу», сярод якіх быў і мой самы блізкі — ад студэнцкіх гадоў і на ўсё жыццё! — сябра Барыс Сачанка. Яго кнігазбор меў рарытэты: першыя выданні, прыжыццёвыя выданні, замежныя пасобнікі.

Я ж збіраў жывую бібліятэку. Для працы і асалоды.

Я шанаваў кожную кнігу. Браўся разглядаць новыя набыткі свае толькі старанна памыўшы рукі. Нікому не дазваляў загінаць у кнігах старонкі, крэсліць іх. Я люблю кнігу і таму шанаваў яе, даражыў ёю.

Дарэчы, сваю кнігу пра Беларусь «Зялёны лісток на планеце Зямля», праца над якою вымагала найбагацейшага і разнастайнага даведачнага матэрыялу, я напісаў у сваёй хатняй бібліятэцы.

І вось гэтую кнігу пра кнігі я зноў жа ў сваёй кніжніцы, у сваёй скарбніцы пішу.

Амаль уся беларуская літаратура ў маёй бібліятэцы з аўтографамі.

А самы першы і самы дарагі мне аўтограф я атрымаў яшчэ школьнікам. Ды які аўтограф! Цуд! Ды ад каго! Ад самой Уладзіславы Францаўны Луцэвіч — жонкі Янкі Купалы! Ды на якой кнізе! На другім томе Збору твораў Песняра! Ды дзе! У музеі Янкі Купалы!

Жонка самога класіка беларускай літаратуры, якога тады я вывучаў у школе, мне, вучню Зубрэвіцкай дзесяцігодкі, што ад купалаўскіх Ляўкоў знаходзіцца ўсяго толькі за нейкіх дзесяць кіламетраў, зрабіла такі шыкоўны падарунак!

У Мінск, у музей Янкі Купалы я ездзіў «зайцам» — на даху вагона. Грошай не было, а падарожнічаць хацелася. Вось я і прыдумаў такую форму «перасоўвання» — на вагонах. І куды толькі не наведваўся такім чынам! Пазней нават дакументы для паступлення ва ўніверсітэт зноў жа вазіў на даху вагона.

«На ўспамін аб Ляўках», — напісала на Купалаўскім томе Уладзіслава Францаўна. І паставіла дату: «29.VII.53 г.».

Мне тады было сямнаццаць гадоў...

Уладзіслава Францаўна сама паказвала мне, хлапчуку, — аднаму! — музей, сама вадзіла ад экспазіцыі да экспазіцыі, расказвала пра Янку — толькі так яна называла свайго мужа: «А Янка быў». «А Янка сказаў». «А Янка бачыў»...

Яна хацела пакарміць мяне, але я сціпла адмовіўся: маўляў, у мяне ёсць тут знаёмыя і я прыехаў да іх. І потым пашкадаваў, што адмовіўся: тую палавінку буханкі хлеба, якую, паснедаўшы раніцою, схаваў у кустах маладога, толькі што насаджанага купалаўскага парку — адны пруцікі! — здаецца, непадалёку ад таго месца, дзе пазней узнікне фантан з дзяўчатамі, якія пускаюць вянкі, — я ўжо не знайшоў: мусіць, раней за мяне хлеб адшукалі ці птушкі, ці сабакі...

Цёця Уладзя купіла мне білет у цырк — нейкае заезджае шапіто з матацыклетнымі гонкамі ў коле, раскінуўшы свой брызентавы шацёр у парку імя Горкага, — свайго цырку ў Мінску тады яшчэ не было, — якраз давала свае прадстаўленні.

А ўвечары, калі сцямнелася, пайшоў на вакзал.

Дадому з Мінска я дабіраўся таксама на даху вагона — гэтак жа, як ехаў і ў Мінск. А на даху ж, калі ты пераскокваеш з вагона на вагон, ратуючыся ад тых, хто цябе ловіць, каб ссадзіць, патрэбны не толькі ногі, але і вольныя рукі. Таму я падарунак Уладзіславы Францаўны паклаў за пазуху — тужанькая гумка ўнізе футболкі, ведаў, не дасць кнізе выпасці.

Як я ганарыўся гэтым падарункам тады, яшчэ вучнем! Ганаруся ім і сёння: то ж сама цёця Уладзя падпісала мне кнігу нашага Прарока!

А пазнаёміўся з цёцяю Уладзяю ў Ляўках.

Было лета 1952 года. Беларусь святкавала сямідзесяцігоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы. Мы, школьнікі, тыя, хто скончылі восьмы клас. Хтосьці з нас, здаецца, Толя Круцікаў, вычытаў у раённай газеце, што ў Ляўках адбудзецца свята паэзіі ў гонар гэтага юбілею, на якое прыедуць знакамітыя госці з Мінска. І мы ўчатырох — Толя Круцікаў, Міша Сліжоў, Пеця Рашчоцін і я — пайшлі пехатою ў Ляўкі.

Памятаю лясную дарогу праз урочышча, якое называецца Коззе, — яшчэ халаднаватую зранку. Памятаю, як ужо з раніцы нагрэты, нібы прысак, дарожны пыл на палявой дарозе за Герасімоўшчынай апякаў босыя ногі. Памятаю, як на пароме, на якім мы пераплывалі каля Александрыі Дняпро, конь, запрэжаны ў калёсы, чамусьці вельмі задумліва глядзеў у ваду. Памятаю, як на беразе мы доўга, спрачаючыся, выбіралі сцяжыну праз кустоўе, праз вербалозы, па якой трэба ісці, каб патрапіць у Ляўкі, — дзіўна, мы тады яшчэ не ведалі, што ўсе яны прывядуць нас менавіта туды, куды нам і трэба — да былой дачы Песняра.

Цёця Уладзя ўразіла нас сваёй прастатою, зычлівасцю, дабрынёю. Нам адразу ж здалося, што мы ведаем яе вельмі даўно, што яна нібыта наша аднавяскоўка. Яна ўсё параспытвала ў нас, усім цікавілася, уважліва слухала тое, што мы расказвалі і пра Зубрэвічы, і пра зубраўцоў, што нам здалося: цёця Уладзя была ў нашай вёсцы! І мы нават адважыліся спытаць у яе пра гэта.

— Не, не была, — усміхнулася яна. — Чуць — чула, але не была, — і, паглядзеўшы чамусьці на мяне, і, мусіць, убачыўшы, што мне больш за ўсіх хочацца, каб яна сказала «была», са шкадаваннем дадала: — І Янка таксама не быў...

Але ж яна чула пра маю вёску! І Янка Купала, вядома ж, таксама чуў пра Зубрэвічы!

Уладзіслава Францаўна была такая ж ужо клапатлівая з намі — як маці: хлопчыкі, хлопчыкі... Калі мы сказалі пра гэта Анатолю Астрэйку, які быў на гэтым свяце і таксама здаўся такім ужо свойскім зубрэвіцкім дзядзькам, ён, пыхкаючы цыгарэтаю, усміхнуўся:

— А яна, хлопцы, для ўсіх нас як родная маці. І нас, старых, яна таксама хлопчыкамі заве.

Пазнаёміліся мы тады і з Васілём Віткам, які на той час быў вядомы як аўтар п'есы пра Янку Купалу «Шчасце паэта». Нам ён запомніўся сваім інтэлігентна-далікатным, загадкава-таямнічым выглядам. Ён з дабрынёю ўсміхаўся праз акуляры і больш маўчаў, але за гэтым маўчаннем адчуваліся многія веды і мудрасць.

Мы сядзелі на траве перад самаю сцэнаю, якую на паляне каля лясніцтва змайстравалі перад святам — дошкі яшчэ свежа пахлі смалою.

Уяўляеце, з якім захапленнем слухалі мы ўпершыню ў жыцці жывых паэтаў!

На развітанне цёця Уладзя пажадала нам, цікаўным, добра вучыцца і запрашала ў Мінск, да яе ў «Янкаў музей».

— Хлопчыкі, я ўсё вам пакажу і пра ўсё раскажу.

Хлопцы не адважыліся на такую дарогу і таму ў Купалаўскі музей я, як бачыце, паехаў адзін.

Развітваючыся са мною ў сталіцы, Уладзіслава Францаўна зноў жа казала, раіла ўжо мне аднаму:

— Хлопец, табе трэба вучыцца. Закончыш школу, прыязджай у Мінск, паступай ва ўніверсітэт.

І я прыехаў. Зноў жа на даху вагона. І паступаў у БДУ. Але не спраўдзіў спадзяванняў Уладзіславы Францаўны — не прайшоў па конкурсе: з сямі прадметаў, якія мы здавалі на ўступных экзаменах, пяць я здаў на выдатна, а па двух — атрымаў чацвёркі. Прымалі ж толькі з адною чацвёркаю...

Паступіў я на журфак БДУ ўжо на наступнае лета, папрацаваўшы год літсупрацоўнікам у Шклоўскай раённай газеце.

Цёця Уладзя цікавілася, я адчуваў, лёсам «зубрэвіцкага мальца».

Рэч у тым, што я яшчэ школьнікам напісаў просценькі, вучнёўскі верш «Ляўкі», і ён спадабаўся Уладзіславе Францаўне. Яна ўключыла яго нават у зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці паэта, які пад грыфам Акадэміі навук Беларускай ССР і пад рэдакцыяй Пятра Глебкі выйшаў у 1955 годзе.

І потым, калі адбывалася рэспубліканская нарада маладых пісьменнікаў Беларусі, па яе прапанове Саюз пісьменнікаў БССР уключыў і мяне ў спіс удзельнікаў.

З тае нарады ў мяне захоўваецца, як вельмі дарагая рэліквія, фотаздымак з Якубам Коласам. Ён даволі такі вядомы, друкаваўся шмат у якіх, нават энцыклапедычных, выданнях: дзядзька Якуб і мы, як птушаняты, абступілі яго з усіх бакоў — Толя Клышка, Грыша Барадулін, Гена Бураўкін, Вася Зуёнак, Сеня Блатун, Жэня Крупенька, я і іншыя пачаткоўцы.

І аўтографам Уладзіславы Францаўны Луцэвіч я вельмі ганаруся і сёння берагу яго, даражу ім і шаную як святыню.

# РАДНЯ...

Як многа ў гэтым кароткім слове для кожнага беларуса. Памяць. Павага. Радавод. Лёс. Жыццё. І, вядома ж, Любоў... Да радні (менавіта так адчуваю сваіх палешукоў — землякоў з Гомельскай Ельшчыны, вёскі Аляксандраўка) забегла на хвілінку праведаць, як там у новым гарадскім жыцці дзядзька Іван, цётачка Тацяна, больш маладзейшыя і зусім малодшыя Надзея Іванаўна, Настачка з Алёшам, як іх завіханні на сядзібе, упарадкаванне на «новай зямлі». Будуюцца ўсё ж, колькі гадоў... Таму не самая лёгкая паласа ў жыцці маіх зямлякоў.

Пагаварылі пра жыццё-быццё. Пра тое, што хутка імчыцца яно, і што Бог дае адзінае жыццё. А ў ім ёсць адзіная праўда: без любові адзін да другога, без Радзімы — няма чалавека...

— Бо інакш жыццё пражыць, што на свінні праехаць, — зазначыла цётка Тацяна.

На тым і пагадзіліся. Цётачка хуценька дастала з шафы прыгожы вясковы абрус, сабрала на стол.

— За ўсё добрае! Будзьма! — падняў чарку дзядзька Іван. І нейк добра, спакойна на сэрцы стала ад гэтай сустрэчы. Так і здымак атрымаўся: Іван Іванавіч Сіўчук, ветэран Вялікай Айчынай вайны і працы, пацярпелы ад аварыі на ЧАЭС, Сыч Тацяна Міхайлаўна, таксама пацярпелая ад Чарнобыля. А з бацькам і цёткай Надзея Журко з дачкой Настачкай і зяцем Алёшам. А за імі яшчэ радня і наша памяць, любоў і павага...

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

# «ЧАМУ З БЕЛАРУСАЎ БЯРУЦЬ ГРОШЫ ЗА ЖАДАННЕ ДАВЕДАЦЦА ПРА СВАЮ ШЛЯХЕТНАСЦЬ?..»



Кніга выйшла сумесна з газетай «Звязда».

**Мастак Уладзімір КРУКОЎСКІ сумесна са «Звяздой» і РВУ «Літаратура і мастацтва» выдаў кнігу гербаў беларускай шляхты — «Срэбная страла ў чырвоным полі». Прэзентацыя кнігі адбылася ў мінскім «Кніжным салоне» (Калініна, 5). Пасля прэзентацыі мастак адказаў на нашы пытанні.**

***— Спадар Уладзімір, гербы, прыведзеныя ў кнізе — узятыя з нейкіх крыніц ці вы як мастак іх аднавілі?***

— Што вы, я не займаюся аднаўленнем гербоў! Усе гербы ў кнізе — аўтэнтыка, фотаздымкі (не перамалёўкі!) гербоў, якія ўдалося адшукаць, галоўным чынам, у Нацыянальным гістарычным архіве, а таксама ў іншых архівах, музеях Беларусі.

***— Няўжо яны ўсе захаваліся ў каляровых выявах?***

— Многія — так. Бо колер адыгрывае вельмі важную ролю, ён шмат распавядае пра герб. Калі фон шчыта блакітны і калі — чырвоны, то гэта дзве розныя рэчы. Таму перамалёўка і тым больш «аднаўленне» гербоў па апісанні — вельмі складаная і далікатная справа. Даў троху не той колер — гэта ўжо іншы герб. Не так намаляваў ці змяніў дэталь вершніка — герб азначае ўжо нешта іншае. Такім чынам, удалося расшукаць і ўключыць у кнігу 156 каляровых выяў гербоў. Чорна-белыя ілюстрацыі ўзяты са старых выданняў. Агулам выходзіць каля 200 гербоў. Іх выявы я не кранаў ніякім чынам.

***— Якую мэту вы ставілі перад сабой пры ўкладанні кнігі?***

— Перш за ўсё — сабраць гэты цікавы матэрыял, апрацаваць яго і давесці да людзей. Вы, пэўна, ведаеце, як нішчылі нашу шляхту царскія ўлады. Пра бальшавікоў я ўжо і не кажу — тыя татальна ўсё вынішчылі, увесь напамін пра шляхетнасць... Але ў часы ўваходжання Беларусі ў Расейскую імперыю царскі ўрад усімі спосабамі, якімі толькі можна, нішчыў нашу шляхту. Выключалі з усіх спісаў, дзе толькі можна. Пазбаўлялі шляхецтва. Цэлымі тысячамі высылалі на Усход, у Сібір... Таму мая першая задача была — візуальнае азнаямленне чытача з маляўнічай спадчынай. А больш глыбока — паказаць людзям, што ў нас была сапраўдная, натуральная, беларуская шляхта. Не польская шляхта і не расейскія дваране, а нашая, тутэйшая, беларуская шляхта.

***— У непадрыхтаванага чытача ўзнікне пытанне: чаму адным гербом маглі карыстацца 20 ці 30 прозвішчаў, сем'яў?***

— Такая была нашая традыцыя. Калі ў Заходняй Еўропе герб вызначаў асобу — кожны рыцар, кожны шляхціц меў свой герб — то ў нас герб быў больш шырокага ўжытку. Таму адным і тым жа гербом маглі карыстацца Вярбіцкія і Статкевічы, Вайткевічы і Кожухі... Ёсць гербы-чэмпіёны. Вось герб «Ястрабец» быў самы распаўсюджаны на Беларусі — пад гэтым гербам існавала каля 300 розных родаў!..

***— Хто гэта вырашаў — дазволіць роду карыстацца гербам ці не?***

— Даўней гэта вырашаў князь ці кароль, у царскія часы вырашаў урад або мясцовыя губернскія дваранскія сходы. У Пецярбургу быў цэлы дэпартамент, які займаўся гэтымі пытаннямі. Гербы часам


Уладзімір Крукоўскі сабраў пад адной вокладкай 200 гербоў беларускай шляхты.

раздаваліся за нейкія асабістыя ці дыпламатычныя поспехі, а маглі даць герб і за тое, што своечасова паднёс келіх віна каралю...

***— У кнізе, вы кажаце, каля 200 гербоў. Гэта — усе гербы беларускай шляхты?***

— Што вы! Беларуская шляхта выкарыстоўвала каля 900-1000 гербоў!

***— Значыць, вашу кнігу энцыклапедыяй не назавеш?***

— Не, давайце назавём працей — даведнік.

***— Ці тлумачыце вы ў кнізе, якія элементы гербоў што значаць?***

— Не, я спасылаюся на крыніцы, дзе гэта тлумачыцца. На гэтую тэму напісана настолькі шмат нашымі, расійскімі ды польскімі геральдыстамі, што паўтарацца не было сэнсу. Задача была — даць дакладную выяву герба і паказаць, якія роды ім карысталіся. Паказаць, што гэта — беларускія роды. А то, ведаеце, як парасцягалі маёмасць нашу ў розныя часы, гэтак парасцягалі і нашу шляхту. Праваслаўны? Значыць, сапраўды рускі, дваранін! Каталік? Значыць, праўдзівы шляхетны паляк! А мы дзе? Дзе нашая шляхта — бульбу выбірае? Зямлю арэ? А вось мы — у гэтай кнізе!

***— Якія самыя незвычайныя выявы трапляліся вам на гербах? Можа, які певень ці казёл...***

— Пеўня я не сустракаў у часе пошукаў — хоць мог і быць... Казла сустракаў. Увогуле, ёсць пяць асноўных тэматык выяў. Першая — узбраенне: стрэлы, дзіды, конскія падковы, меч, шлем... Другая — жывёлы, птушкі. Трэцяя — архітэктурныя дэталі: брама, вежа, кавалак мура... Далей — рэлігійныя сімвалы. І рэшта — астранамічныя сімвалы: месяц, сонца, поўня, зоркі... А, яшчэ забыўся сказаць — асобную групу складаюць часткі чалавечага цела: рука, вока, галава, нага... Нага ўзброеная ці аголеная — гэта значыла зусім розныя рэчы! У кожнай групе хапае загадкавых сімвалаў і выяў. Скажам, выяўлены шасціканцовы крыж на гербе «Сухакамнаты», і адно ніжняе плячо зламанае ці наогул адсутнічае. Ці, скажам, вельмі стары герб «Гіпацэнтаўр»: кентаўр страляе з лука ва ўласны хвост у выглядзе змяі! Як гэта ўтварылася?.. Вядома толькі, што гэты герб прыйшоў да нас са Старажытнага Рыма. Такія гербы сягаюць далёка ў сівыя стагоддзі.

***— Колькі часу пайшло ў вас на стварэнне кнігі?***

— Калі лічыць ад задумы да выдання — 17 гадоў.

***— Я так разумею, што «Звязда» адыграла тут пэўную ролю?***

— Яшчэ якую! Са «Звяздой» звязаны і мой асабісты радавод — газета надрукавала яго ў верасні 1990 года. А цягам 2007-2008 года ў «Звяздзе» фактычна былі надрукаваны ўсе каляровыя гербы, якія ўвайшлі ў кнігу. Раней гербы друкаваліся таксама ў часопісе «Спадчына». Відавочна, што ў кнізе яны больш якасныя, большага памеру, дададзена інфармацыя. Калі гэта друкавалася ў «Звяздзе», я адчуваў самае каштоўнае — жывую рэакцыю: чытачы прысылалі мне лісты, тэлефанавалі!.. Значыцца, не дарма я гэта ўсё рабіў!

***— Як вы ставіцеся да таго, што сёння многія людзі, якія фактычна не маюць шляхетных каранёў, актыўна пачынаюць іх шукаць, знаходзяць шляхетнае прозвішча ў якойсьці там прабабулі, адразу ж бяруць сабе той герб, трохпавярховае прозвішча...***

— На здароўе! Хай бяруць! У іх жа ёсць гены той прабабулі? Значыць, могуць браць! У наш час за гэта ўжо не даюць прывілеі, а калі чалавек ад гэтага будзе адчуваць сябе больш годна — калі ласка!

***— Як вы лічыце, калі чалавек захоча сабе сёння вымысліць герб, якія выявы могуць на ім быць?***

— Усё што заўгодна! Абы гэта было падпарадкавана правілам гербаўтварэння.

***— І што, калі чалавеку падабаецца Нацыянальная бібліятэка — хай малюе на гербе?***

— Бібліятэку? На гербе? Калі ласка! Прыдумайце форму шчыта, колер — і малюйце! Хочаце «алмаз ведаў» — на здароўе!

***— Ці можа звычайны чалавек самастойна працаваць над пошукам свайго герба?***

— Ведаеце, напрыклад, у нашых суседзяў літоўцаў гэты фонд у архіве адкрыты — прыязджай, фатаграфуй, капіруй, перапісвай... А нашым у Нацыянальным гістарычным архіве закрылі — толькі іх супрацоўнікі могуць там шукаць! А вы за гэта заплаціце вялікія грошы!.. Гэта зроблена пад выглядам клопату — маўляў, «спарахнелыя дакументы». А чаму ў літоўцаў такія самыя дакументы не спарахнелыя? Добра. Спарахнелыя — дык адсканіруйце, хай людзі шукаюць у электронным варыянце, як гэта робіцца ва ўсім свеце. Дык не. Плаці грошы. Для чаго гэта зроблена? Нехта хоча зарабіць на жаданні беларусаў аднавіць памяць пра сваю шляхетнасць?..

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**



Герб-рэкардсмен: ім карысталіся каля 300 беларускіх родаў!..

# ТРАПЯТКІЯ ЛАНІ ВЯРТАЮЦЦА

**На тэрыторыю Баранавіцкага лясгаса завезлі 16 ланяў еўрапейскіх, і цяпер на Брэстчыне гэтая жывёліна не будзе лічыцца экзатычнай.**



Думаў, што лань еўрапейская і казуля еўрапейская — гэта адна і тая ж дзікая жывёла, бо мае падабенства.

— *Лань еўрапейская значна большая за казулю, але меншая за аленя высакароднага. А яшчэ ў самцоў лані канцы рагоў падобныя на лапатку, а ў аленя яны разгалістыя,* — паведаміў **дырэктар мясцовага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алег ГЕЙЛАШ**.

— Перспектыва ў лані ёсць?

— *Для Беларусі ўсё ж гэта нетыповы звер, ды і клопату з ім шмат. Нездарма кажуць, што лань — трапяткая жывёліна. Магчыма, яна будзе запатрабаваная паляўнічымі Заходняй Еўропы, а для нас больш звыклыя ласі, алені ды казулі.*

Некалькі гадоў таму на Віцебшчыну завезлі 60 ланяў з Прыбалтыкі, і сёння яны там сталі паляўнічым відам.

Акрамя Баранавіцкага раёна, лані еўрапейскія завезены ў Жыткавіцкі раён Гомельшчыны.

Пакуль што лані пад Баранавічамі будуць знаходзіцца ў вальерах каля возера Гаць — тут пройдуць акліматызацыю. А потым могуць трапіць і на мушку браканьера, які асабліва не разважае, які звер перад ім — алень высакародны ці лань еўрапейская.

Дарэчы, некалі ў Англіі з браканьерамі паступалі вельмі сурова. За забітых лань ці аленя адразу вешалі, а калі браканьер здолеў уцячы, то яго ў адпаведнасці з указам караля мог забіць кожны стрэчны. Можа, таму сёння ў Англіі звяры не вельмі баяцца чалавека. Людзі гуляюць у гольф, а лані побач скубуць траву. А наш браканьер нават на судзе можа заявіць: «Страляў і страляць буду».

І чым яго можна напалохаць? Відавочна, толькі каралеўскім указам, але ж жывём у XXI стагоддзі...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ХУЛІГАНЫ БІЛІ ІНШАЗЕМНЫХ СТУДЭНТАЎ

**У Віцебску асуджаныя два хуліганы, якія на вуліцах білі іншаземных грамадзян.**

Як расказаў «Звяздзе» **Віталь СУЗАНСКІ, старшы пракурор аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў і аналізе судовай практыкі,** адзін з асуджаных — грамадзянін Расіі. Яму 19 гадоў, халасцяк, жыў у Віцебску. Другому 25 гадоў. Ён грамадзянін нашай краіны, жанаты, ёсць няпоўнагадовае дзіця. Абодва беспрацоўныя. Крыўдзілі іншаземных студэнтаў-медыкаў — грамадзян Пакістана і Шры-Ланкі.

Папаліся міліцыі, калі ўдвох пабілі двух іншаземцаў на праспекце Фрунзэ. Жанчына, якая стала выпадковай сведкай бойкі, выклікала міліцыю.

Прыгаворам суда расіянін быў асуджаны на год пазбаўлення волі. А нашага земляка арыштавалі на чатыры месяцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Прыйшла Каляда







**На здымках:**

**Гурт калядоўшчыкаў вёскі Люсіна Ганцавіцкага раёна ідзе шчадраваць у хаты аднавяскоўцаў.**

**Калядоўшчыкі завіталі ў хату 82-гадовай Таццяны Крупеніч.**

**Люсінскіх калядоўшчыкаў вітае старэйшая жыхарка Галіна Васілевіч і яе кот Цімка.**

Фотарэпартаж Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 28 января 2011 г. 107-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

## по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

| № предмета аукциона | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв. м. | Цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска», тел. 252-80-63** | | |
| 1. | Пр. Газеты «Правда», 20, часть помещения на первом этаже отдельно стоящего здания. Имеется отопление, энергоснабжение, санузел совместного пользования. Для размещения торгового автомата по продаже горячих и холодных напитков. | 3,0 | 105 |
| 2. | Ул. Дрозда, 7, пом. 2Н, помещение на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, канализация. Под аптеку. | 71,1 | 2 500 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294-01-11** | | |
| 3. | 2-ой пер. Багратиона, 20, помещения на первом этаже отдельно стоящего здания, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Под ремонт бытовой техники, пункт приема заказов на ремонт мебели. | 28,7 | 1 005 |
| 4. | Ул. Первомайская, 18, чердачное помещение, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами. Под административное использование (офис). | 17,1 | 600 |
| | **КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292-74-31, 261-27-38** | | |
| 5. | Логойский тракт, 39/2, помещение на первовм этаже, имеется отопление, санузел, отдельный вход, требуется ремонт и установка счетчиков учета воды и электроэнергии за счет средств арендатора. Под ремонт одежды, стоматологические услуги. Под административное использование (офис). | 33,1 | 1 160 |
| | **КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска», тел. 204-30-46** | | |
| 6. | Ул. Харьковская, 86А, помещение на первом этаже жилого дома, имеется отдельный вход, отопление, водоснабжение, энергоснабжение, в 2012 году планируется капитальный ремонт. Под парикмахерскую. | 71,3 | 2 500 |
| 7. | Ул. Бурдейного, 13, помещение на первом этаже отдельно стоящего здания, имеется отопление, энергоснабжение, общий вход с другими арендаторами. Под административное использование (офис). | 13,2 | 462 |
| | **КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска», тел. 203-79-43, 203-34-66** | | |
| 8. | Ул. Заславская, 27, помещение на первом этаже жилого дома, вход совместно с жильцами, отсутствует водоснабжение, канализация. Под административное использование (офис), кабинет по оказанию психологической помощи. | 13,0 | 455 |
| 9. | Старовиленский тракт, 28, корп. 1, технический этаж, отсутствует водоснабжение, канализация. Под административное использование (офис), под творческую художественную мастерскую. | 15,1 | 530 |
| 10. | Пр. Победителей, 83, помещение на первом этаже, имеется общий вход с другими арендаторами. Под административное использование (офис). | 14,0 | 490 |
| | **КУП «Минская спадчына», тел. 226-53-04, 226-47-34** | | |
| 11. | Ул. Герцена, 10, комната на первом этаже здания, имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Для оказания услуг населению, размещение специалистов (кроме парикмахерских, медицинских, прачечных услуг, услуг по химчистке). | 28,5 | 1 000 |
| 12. | Ул. Революционная, 6в, блок из семи комнат, коридоров и санузлов на первом этаже здания. С условием финансирования за счет средств арендатора, без последующей компенсации затрат на работы по приспособлению помещений под целевое назначение: отделочные работы и технологическое оборудование помещений. Заключение договора аренды с момента ввода здания в эксплуатацию. Под услуги населению (кроме парикмахерских), под магазин непродовольственной группы товаров. | 181,13 | 6 340 |
| 13. | Ул. Революционная, 6в, блок из восьми комнат и коридора на втором этаже здания. Имеется естественное освещение, отопление, санузел, вход совместно с другими арендаторами. Заключение договора аренды с момента ввода здания в эксплуатацию. Для размещения специалистов органов управления, специалистов. Под услуги населению (кроме парикмахерских). | 179,56 | 6 300 |
| 14. | Ул. Революционная, 13, блок из четырех комнат на первом этаже здания. Имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. С условием финансирования за счет средств арендатора (без последующей компенсации затрат) технологического оборудования помещений, без изменения планировки помещения. Заключение договора аренды с момента ввода здания в эксплуатацию. Под услуги населению (кроме парикмахерских, медицинских, прачечных и услуг по химчистке). | 54,7 | 1 920 |
| 15. | Ул. Революционная, 13, блок из шести комнат, кладовой и санузла на втором этаже здания. Имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Заключение договора аренды с момента ввода здания в эксплуатацию. Для размещения руководителя и иных специалистов органов управления. | 213,39 | 7 500 |
| 16. | Ул. Сторожевская, 5, помещение на втором этаже здания, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Для размещения руководителя и иных специалистов органов управления. Размещение специалистов. | 13,0 | 455 |
| 17. | Ул. Сторожевская, 5, помещение на втором этаже здания, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Для размещения руководителя и иных специалистов органов управления. Размещение специалистов. | 10,7 | 375 |
| 18. | Пл. Свободы, 8, часть помещения (холл) на первом этаже административного здания. Под размещение торгового автомата по продаже кофейных напитков. | 4,0 | 140 |
| 19. | Ул. Комсомольская, 7, блок из комнаты и кладовой на мансардном этаже здания, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Для размещения руководителя и иных специалистов органов управления. Размещение специалистов. | 21,0 | 735 |
| | **КУП «Минский городской центр недвижимости», тел. 328-51-00, 222-34-42** | | |
| 20. | Пр. Победителей, 5, блок из двух помещений № 405, 410 и санузла на четвертом этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение. Под административное использование (офис). | 73,3 | 2 570 |
| 21. | Пр. Победителей, 5, помещение № 416 на четвертом этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, отсутствует санузел. Под административное использование (офис). | 13,1 | 460 |
| 22. | Ул. Замковая, 28, помещения № 4, 5, 6, 7, 13а, 15, 18 на втором этаже. Имеется водоснабжение, санузел. Под административное использование (офис). | 92,4 | 3 240 |
| | **КУП «Минсктранс», Филиал «Троллейбусный парк № 4», тел. 204-79-15, 219-86-13** | | |
| 23. | Ул. Любимова, 22/51, часть помещения в здании общежития. Для размещения автомата по продаже горячих напитков. | 1,5 | 52,5 |
| 24. | Ул. Одоевского, 113, три смежных помещения, имеется отопление, водоснабжение, энергоснабжение, санузел совместного пользования. <u>*Примечание:*</u> *Сдается в аренду до момента сноса здания. Решением МГИ от 10.01.2008 № 24 утвержден проект детального пранирования территории в границах ул. Одоевского-Бельского-Пономаренко. По большинству участков заказчики определены. Ведется проектирование и строительство. Неосвоенными остались некоторые участки, в том числе и диспетчерский пункт разворотного кольца по Одоевского, 113.* Под оказание услуг по согласованию с арендодателем (кроме СТО). | 22,9 | 805 |
| | **УЗ «5-я городская поликлиника», тел. 376-19-01** | | |
| 25. | Ул. Есенина, 21, площадь в холле первого этажа поликлиники. Для размещения торгового объекта по продаже лечебной косметики и товаров для здоровья. | 9,0 | 315 |
| | **Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома, тел. 220-51-34, 219-00-78** | | |
| 26. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, подземный общественно-торговый центр (ТЦ «Столица»), место № 301.1 (верхний уровень), под розничную торговлю воздушными коктейлями и мороженым (ограничение торгового оборудования по высоте – не более 1 000 мм).* | 12,16 | 427 |
| 27. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, подземный общественно-торговый центр (ТЦ «Столица»), место № 335 (средний уровень), целевое назначение – розничная торговля конфетной продукцией (ограничение торгового оборудования по высоте не более 1000 мм).* | 12,16 | 427 |
| 28. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, подземный общественно-торговый центр (ТЦ «Столица»), место № 528 (средний уровень), целевое назначение – розничная торговля косметической продукцией.* | 17,28 | 607 |
| 29. | Тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, подземный общественно-торговый центр (ТЦ «Столица»), место № 348 (нижний уровень), целевое назначение – розничная торговля сувенирной продукцией, часами.* | 19,27 | 677 |
| | **Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома ТКУП «Минский оптовый рынок», тел. 321-20-00** | | |
| 30. | ТЦ «Купаловский» место, № 37 (под розничную торговлю непродовольственными товарами). | 5,6 | 196 |
| | **УП «Партизанское», тел. 200-11-84** | | |
| 31. | Ул. Стебенева, 2, помещение в административно-хозяйственном здании. Под административное использование (офис). | 15,9 | 557 |
| | **КТУП «Минский комаровский рынок», тел. 331-84-00** | | |
| 32. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 1, ряд № 12, киоск № 3. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 3,8 | 133 |
| 33. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 4, ряд № 8, киоск № 13. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 19,6 | 686 |
| 34. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 2, ряд № 10, киоск № 10. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 3,6 | 126 |
| 35. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 3, ряд № 11, киоск № 5. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 3,7 | 130 |
| 36. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 2, ряд № 11, киоск № 3. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 4,0 | 140 |
| 37. | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного рынка, сектор № 2, ряд № 12, киоск № 2. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 3,8 | 133 |
| 38. | Ул. В. Хоружей, 8, территория крытого рынка, антресольный этаж, павильон № 76. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами. | 10,1 | 353,5 |
| 39. | Ул. В. Хоружей, 8, помещение № 21 в административно-хозяйственном корпусе на первом этаже. Под склад. | 16,4 | 575 |
| | **УП «Белизна», тел. 267-89-44, 281-48-42** | | |
| 40. | Ул. Кнорина, 55, помещение на первом этаже. Под склад. | 11,6 | 406 |
| 41. | Ул. Кнорина, 55, помещение цокольного этажа, требуется ремонт. Под склад. | 118,4 | 4 150 |
| 42. | Ул. Кнорина, 55, помещение на втором этаже. Под административное использование (офис), торговый объект непродовольственной группы товаров, выставочный зал, производственное использование (кроме швейного ). | 86,0 | 3 010 |
| | **ОАО «Строительный трест № 4» Жилищно-коммунальная контора, тел. 280-26-96** | | |
| 43. | Ул. Фабрициуса, 7/6, три комнаты на первом этаже, имеется отопление, водоснабжение. Под риэлтерские, туристические услуги, оказание услуг населению. | 42,1 | 1 480 |
| | **УП «УДМС и Б» Мингорисполкома, тел. 200-26-10** | | |
| 44. | Ул. Судмалиса, 15, помещение на первом этаже, имеется отдельный вход. | 59,8 | 2 100 |
| | **УП «Минскводоканал», тел. 227-37-04** | | |
| 45. | Минский р-н, Ждановичский с/с, Ждановичи, отдельно стоящее двухэтажное кирпичное здание (канализационная насосная станция № 8), имеется естественное освещение, отдельный вход, отсутствует отопление. Под производственное использование. | 250,4 | 8 800 |
| | **Учреждение «Детско-юношеская спортивная школа по лыжным видам спорта», тел. 297-90-19** | | |
| 46. | Ул. Корженевского, 45, помещение на втором этаже здания горнолыжного центра «Солнечная долина», имеется отопление, помещение магазина – 22,11 кв.м, комната отдыха персонала – 10,26 кв.м, рекламные витрины. Под магазин для продажи спортивного инвентаря и оборудования. | 48,86 | 1 715 |

| № предмета аукциона | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв. м. | Цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **УП «Многопрофильный культурно-спортивный комплекс «Минск-арена», тел. 279-04-18** | | |
| **47.** | Пр. Победителей, 111, открытая площадка, примыкающая к многоуровневой автостоянке. Под установку павильона для размещения специалистов по оформлению автомобилей, хранящихся на стоянке. | 36,0 | 1 260 |
| | **УП «Чижовский рынок», тел. 340-82-32** | | |
| **48.** | Ташкентский проезд, 5, помещение склада № 1. Под склад для хранения продовольственных, промышленных товаров. | 39,0 | 1 370 |
| **49.** | Ташкентский проезд, 5, помещение склада № 2. Под склад для хранения продовольственных, промышленных товаров. | 74,2 | 2 600 |
| **50.** | Ташкентский проезд, 5, помещение склада № 11 в здании крытого рынка, в том числе холодильная камера площадью 4,0 кв.м. Под склад для хранения продовольственных товаров, плодоовощной продукции. | 17,8 | 625 |
| | **УП «Минский зоопарк», тел. 340-21-75, 341-43-85** | | |
| **51.** | Ул. Ташкентская, 40, место-А по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Под мини-кафе. | 40,0 | 1 400 |
| **52.** | Ул. Ташкентская, 40, место-Б по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Для реализации попкорна. | 4,0 | 140 |
| **53.** | Ул. Ташкентская, 40, место Д по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Для реализации сладкой ваты. | 4,0 | 140 |
| **54.** | Ул. Ташкентская, 40, место-Г по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Для реализации игрушек и сувениров. | 4,0 | 140 |
| **55.** | Ул. Ташкентская, 40, место-Е по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Для реализации кислородных коктейлей и мягкого мороженого. | 8,0 | 280 |
| **56.** | Ул. Ташкентская, 40, место-Ж-Р по схеме перечня торговых площадей и аттракционов на территории зоопарка (согласно экспликации). Комплекс из девяти детских аттракционов и кассы для продажи билетов. | 540,0 | 9 450 |
| | **УП «Мингорсвет», тел. 252-41-03** | | |
| **57.** | Ул. Гурского, 38, помещение на первом этаже отдельно стоящего административно-производственного корпуса, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, санузел. Под объект общественного питания (с торговой наценкой не более 70 процентов), для организации специального питания для работников с вредными условиями труда. | 158,2 | 5 500 |
| | **ГУО «Специализированная общеобразовательная школа № 14 для детей с нарушением слуха», тел. 267-83-65** | | |
| **58.** | Ул. Севастопольская, 54, площади расположены в помещении теплицы. Под административное использование (офис). | 16,6 | 581 |

*** – При приобретении предметов торгов с № 26 по № 29 от победителя аукциона требуется соблюдение следующих условий:**

*- разработка дизайн проекта, конструктивного решения, приобретение и установка киоска и необходимого оборудования осуществляется за счет арендатора (без возмещения его стоимости в дальнейшем),*

*- проведение обязательного согласования дизайн проекта и конструктивного решения размещаемого киоска с управлением по эксплуатации ТЦ «Столица» и комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома,*

*- при разработке конструктивного решения на открытый киоск и оборудование обеспечить соблюдение требований отчета НИИ ПБ и ЧС МЧС РБ по оценке обеспечения требуемых параметров путей эвакуации в ТЦ «Столица» при установке торговых мест на неотапливаемых пешеходных улицах торгового центра по пожарной опасности применяемых материалов и ограничении количества размещенных на торговых местах горючих (трудногорючих) веществ и материалов,*

*- разработка и согласование проекта электроснабжения открытого киоска и оборудования в установленном порядке,*

*- дата вступления в силу договора аренды – с момента установки открытого киоска, но не более 2-х месяцев со дня проведения аукциона.*

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Аукцион состоится <u>**28 января 2011 г. в 11.00**</u> по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются <u>**с 17 по 26 января 2011 г. в рабочее время**</u> <u>(перерыв на обед с 13.00 до 14.00)</u> по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

**Срок заключения договора аренды – 5 лет.**

*Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе,* ***<u>в рабочее время</u>*** *обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в настоящем извещении.* ***Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре объекта недвижимости <u>уточнить у арендодателя</u> возможность использования его под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам), а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.***

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012037450010, в ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». <u>**Задаток должен быть внесен до 17.30 26.01.2011;**</u>

**гражданином** Республики Беларусь – **копия документа, удостоверяющего личность**, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31,33 и страница с регистрацией места жительства (пропиской));

**индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства** о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

**юридическим лицом** Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (копии **свидетельства** о государственной регистрации и устава), документ с указанием **банковских реквизитов** юридического лица (информационное письмо), документ о назначении руководителя;

**иностранным гражданином** – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

**представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность;

**представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность;

**представителем иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

<u>**При подаче документов**</u> на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц <u>**предъявляют документ,**</u> удостоверяющий личность.

*При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета,* ***он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления*** *на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.*

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить** УП «Минский городской центр недвижимости» **затраты на организацию и проведение аукциона,** в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов <u>под роспись.</u>**

*В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества на пять лет в срок в соответствии с законодательством.*

*По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе,* ***арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома*** *по упрощенному использованию зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности,* ***заявление с просьбой согласовать сдачу недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды.*** *Заявление* ***должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона,*** *а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.*

*По объектам недвижимого имущества, право аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев с тем субъектом хозяйствования, в отношении которого им направлено заявление о согласовании сдачи в аренду недвижимого имущества.* ***Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by***

# ПАРОГ

**«Праз парог рукі не падавай!», «Без Бога не да парога!», кажуць у народзе. Парог — сімвалічная зона, якая аддзяляе ўнутраную прастору хаты ад знешняй. Парог — рытуальнае месца ў сістэме сямейна-родавых абрадаў.**

● Цяжарнай жанчыне забаранялася сядзець на парозе, каб роды не былі цяжкімі. Калі нараджалася дзяўчынка, пад парог закопвалі дзіцячае месца: каб яна ў свой час «сышла» з хаты, выйшла замуж. Для таго ж ваду, у якой купалі дзяўчынку, вылівалі за парог.

● Перад тым, як несці дзіця ў храм для хрышчэння, каля парога на некалькі хвілін сядалі хросныя з дзіцем, а бацькі павінны былі пакласці пад парог пэўныя рэчы (прылады для выканання тых ці іншых работ), каб у дзіцяці развіваліся здольнасці да таго ці іншага рамяства.

● Пасля хрышчэння дзіцяці на парозе адбываўся абрад уваходу дзіцяці ў хату і сям'ю: хросныя клалі дзіця на некалькі імгненняў на парог, а бацькі паднімалі яго і неслі ў хату.

● Перад тым, як адправіцца да вянца, маладыя праходзілі пад ручніком, у абодва канцы якога закручвалі па бохану хлеба. Ручнік трымалі на высока ўзнятых руках бацькі. Жаніх і нявеста павінны былі прыгнуцца — пакланіцца продкам.

● Пасля вянчання бацькі сустракалі маладых хлебам-соллю перад парогам хаты. Жаніх павінен быў перанесці нявесту праз парог, каб яна ў гэты святочны дзень не сутыкалася з «зонай смерці», каб будучыя дзеці нараджаліся здаровымі.

● Пакласці пад парог соль, зямлю з магілак, іголкі ці іншыя рэчы — нашкодзіць гаспадарам. Гэтыя рэчы акуратна збіралі (не голымі рукамі) і спальвалі на скрыжаванні шляхоў. Венік, якім прыбіралі, у хату ўжо не заносілі.

● Каб засцерагчы сябе і хату ад бед, у парог забівалі асінавы кол, сыпалі асвечаны на Спас мак.

● У паўсядзённым жыцці забаранялася сядзець ці стаяць на парозе — каб не турбаваць продкаў без прычыны. Асабліва гэта забарона тычылася нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат, якія рызыкавалі застацца ў адзіноце.

● Існуе павер'е, што размовы, якія вядуцца праз парог, ці рэчы, перададзеныя праз парог, прывядуць да сваркі. Нельга нічога падаваць і праз іншыя зоны смерці: праз труну з нябожчыкам, праз магілу.

● Калі чалавек, сыходзячы з хаты, раптам чапляўся за парог правай нагой, — гэта прадказвала поспех, а левай — няўдачу.

● Перад тым, як накіравацца ў далёкі шлях, трэба было прысесці, перш чым пераступіць парог роднай хаты: «Без Бога не да парога».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**НЯДЗЕЛЯ, 16 СТУДЗЕНЯ**

Добры час для адпачынку і цесных зносін. А вось вырашэнне практычных пытанняў лепш адкласці. Дзень падыходзіць для таго, каб расслабіцца і «падзарадзіць батарэйкі», але не больш за тое.

**ПАНЯДЗЕЛАК, 17 СТУДЗЕНЯ**

Даволі высокая верагоднасць канфліктаў. Спробы сілай прасунуць сваё меркаванне сустрэнуць жорсткае супраціўленне. Працаваць лепш у адзіноце. Эмацыянальны фон не спрыяе зносінам. Узаемадзеянне з навакольнымі не прынясе жаданых вынікаў.

**АЎТОРАК, 18 СТУДЗЕНЯ**

Добры час для развіцця блізкіх адносін. Будзеце выдатна адчуваць настрой і жаданні навакольных. Трэба быць падрыхтаванымі да таго, што адваротным бокам медаля станугь сентыментальнасць і эмацыйная неабароненасць. Калі такая перспектыва палохае, можна правесці вечар дома, заняўшыся чым-небудзь, што супакойвае.

**СЕРАДА, 19 СТУДЗЕНЯ**

Не самы ўдалы час для праяўлення актыўнасці, прычым працы галавой гэта датычыцца далёка не ў апошнюю чаргу. Павышаная аварыйнасць і складанасці пры карыстанні тэхнікай запатрабуюць высокай ступені асцярожнасці і разважнасці. Выніковасць сённяшняга дня будзе залежыць ад таго, наколькі ўдасца кантраляваць свае імкненні і накіроўваць энергію, недахопу ў якой адчувацца не будзе, у мірнае і канструктыўнае рэчышча.

**ЧАЦВЕР, 20 СТУДЗЕНЯ**

Сёння ўсе свае планы перад ажыццяўленнем трэба ўважліва правяраць на адпаведнасць навакольнай рэчаіснасці. Пры гэтым можна разлічваць на шанцаванне. Але неабходна пастарацца пазбегнуць ціску і спробаў вырашаць пытанні сілавым шляхам.

**ПЯТНІЦА, 21 СТУДЗЕНЯ**

Спрыяльны час для прасоўвання сваіх дзелавых і працоўных планаў. Ёсць магчымасць прысвяціць яго пасіўнаму адпачынку, але можна і выбрацца на свежае паветра ці схадзіць у госці. Зносіны прынясуць задавальненне.

**СУБОТА, 22 СТУДЗЕНЯ**

Выдатны дзень для праяўлення фізічнай актыўнасці, занятак спортам, аднак пры ўмове разумнасці нагрузак. Калі паспрабуеце перавярнуць свет, то дабром гэта не скончыцца. А вось калі захоўваць меру, дык яшчэ правільна накіраваць энергію, то парадуе і працэс, і вынік.

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**

**извещает о проведении <u>26 января 2011 года</u> открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

***Лот № 1 – Капитальное строение (общей площадью 151,9 кв.м) здание бани, инв. № 311/С-33942,*** расположенное по адресу: Гомельская область, Добрушский район, Тереховский поселковый Совет, д. Тереховка, ул. Ленина, 150а. Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. – 7 644 000.

Задаток, с учетом НДС, бел. руб. – 700 000. <u>**Шаг аукциона – 5 %.** Продавец: частное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Тереховка-Агро», Гомельская область, Добрушский район, 247070, ул. Ленина, д. Тереховка.</u>

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 24 января 2011 г. включительно**.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет <u>продавца</u> (частное сельскохозяйственное унитарное предприятие «Тереховка-Агро»): р/с 3012230370016, РКЦ № 12 в г. Добруше ф-ла ОАО БАПБ ГОУ, МФО 912, УНП 490419273. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 199 от 12.10.10.

**Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.20 | 16.18 | 7.58 |
| Віцебск — | 8.16 | 16.01 | 7.45 |
| Магілёў — | 8.10 | 16.08 | 7.58 |
| Гомель — | 8.00 | 16.12 | 8.12 |
| Гродна — | 8.34 | 16.34 | 8.00 |
| Брэст — | 8.27 | 16.42 | 8.15 |

**Месяц**

*Першая квадра 12 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Ульяны, Серафіма, Сільвестра.*

***К.*** *Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.






## 15 студзеня

*Дзве даты*



**1600 год** — нарадзіўся Казімір Семяновіч, мысліцель? гуманіст, інжынер і тэарэтык артылерыі. Выхадзец з сям'і князёў Сямёнавічаў, якія валодалі землямі на Віцебшчыне. Аўтар трактата «Вялікае мастацтва артылерыі», у якім апісаў канструкцыі і выкарыстанне гармат і ракет, тэхналогію вытворчасці пораху і іншых матэрыялаў для артылерыі, а таксама ўпершыню прапанаваў ідэю шматступеньчатай ракеты, ракетных батарэй і стабілізатараў да ракет (з дадаткам чарцяжоў). Яго навуковыя працы і эксперыменты на многія гады наперад вызначылі шляхі развіцця еўрапейскай артылерыі. Прытрымліваўся гуманістычнага светапогляду, войны лічыў найвялікшым бедствам чалавецтва. Памёр пасля 1651 г.

**1850 год** — нарадзілася Соф'я Кавалеўская, славуты матэматык. Першая ў свеце жанчына-прафесар, першая жанчына — член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Вырасла ў Віцебскай губерні ў маёнтку свайго бацькі — генерала Корвін-Крукоўскага, прадстаўніка беларускай шляхты. Асноўныя навуковыя працы прысвечаны матэматычнаму аналізу, механіцы і астраноміі. Аўтар рамана «Нігілістка» і мемуараў «Успаміны дзяцінства». Памерла ў Швецыі ў 1891 годзе.

*Цытата дня:*

***«Жыць трэба лягчэй, жыць трэба прасцей — усё прымаючы, што ёсць на гэтым свеце».***

**Сяргей Ясенін (1895—1925), рускі паэт.**

### «ДАРАГАЯ» ГОСЦЯ

**Слесар лакаматыўнага дэпо ў Баранавічах запрасіў да сябе ў госці 23-гадовую работніцу камбіната хлебапрадуктаў, і ўсё было, быццам бы, як трэба.**

А спахапіўся слесар праз паўмесяца, калі ўбачыў, што няма 320 долараў, залатога пярсцёнка і 700 тысяч рублёў. Вось тады міліцыя і вылічыла, хто і калі гасцяваў у мужчыны. Дарэчы, затрыманая была ўжо раней асуджана за крадзеж.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### КОЛАНЕНАВІСНІКІ ЗНАЙШЛІСЯ І Ў БЫХАВЕ

**«Звязда» паведамляла, што 9 студзеня невядомы пашкодзіў колы аўтамабіляў, прыпаркаваных на вуліцы Будаўнікоў у горадзе Горкі.**

Неўзабаве выявілася, што паслядоўнікі аўтавандалаў ёсць і ў Быхаве. Чатыры жыхары дома на вуліцы Грышына ў раённым цэнтры звярнуліся ў міліцыю з заявай, што невядомы ўвечары 5 студзеня пашкодзіў колы іх прыпаркаваных аўтамабіляў. Урон аўтаўладальнікі падлічылі: амаль 2 мільёны рублёў. Распачата крымінальная справа.

**Алена КАЗЛОВА.**

# «СВАБОДА» — ГЭТА КАЛІ ЎСЕ СКУЛЬПТАРЫ РАЗАМ

**ДА 29 студзеня ў мінскім музеі Сучаснага выяўленчага мастацтва працуе калектыўная выстава скульптуры «Узбагачаючыся адно ад аднаго». Экспазіцыя прымеркаваная да 70-годдзя скульптара-манументаліста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Анатоля Арцімовіча, і дэманструе яго скульптуры побач з творамі яго вучняў розных пакаленняў.**

Анатоль Арцімовіч вядомы беларусам па такіх манументальных творах, як «Прысвячэнне Курапатам», «Уваход у Брэсцкую крэпасць», помнік Еўфрасінні Полацкай у Мінску, помнік князю Ізяславу ў Заслаўі і інш.

Майстар выкладае скульптуру 40 гадоў, таму і выстава атрымалася грунтоўная: прэзентуе бадай усе плыні сучаснага мастацтва скульптуры ў Беларусі. Акрамя таго, выстава сабрала вучняў Арцімовіча не толькі з Мінска, Брэста, Віцебска, Барысава, Магілёва, Гродна і іншых гарадоў рэспублікі, але і з іншых краін свету: Расіі, Польшчы, Францыі. Сярод удзельнікаў выставы Павел Лук, Валеры Магучы, Ігар Засімовіч, Уладзімір Панцялееў, Міхаіл Яршоў, Вольга Нячай, Аляксандр Стралкоў і шмат іншых. Экспазіцыя найперш захапляе сваёй непасрэднасцю: побач з класічнай бронзавай скульптурай гарманічна суседнічае шкляны эксперымент «Дзіцячыя цацкі» маладога творцы Паўла Вайніцкага; побач з драўлянымі «Скандынаўскімі матывамі» Уладзіміра Панцялеева — скульптура «Свабода» Анатоля Арцімовіча. Адным словам, атмасфера свабоды ва ўсю пануе на выставе. Дарэчы, «Свабода» — адно з самых моцных уражанняў ад экспазіцыі. Скульптура, створаная ў мінулым годзе, паказвае чалавека са звязанымі крыламі — матыў, здаецца, не новы, бо мастакі спрадвеку даследуюць феномен свабоды. Але ў пластыцы «Свабоды» Арцімовіча столькі болю, што глядач міжволі адчувае гэты боль сам, адчувае сум па свабодзе, які хацеў перадаць майстар.

— Сур'ёзней прафесіі, чым скульптар, не існуе. Гэта вечная рэч, — **пераканаы Анатоль Арцімовіч.** — На нашай шматпакутнай зямлі, якая вынесла столькі войнаў і гора і якая была практычна пустая ў некаторыя часы, напэўна, зараз прарастае зерне, якое хоча аднавіць гісторыю. Яно прарастала з Бембелем і яшчэ раней, яно прарастае і з маімі вучнямі... Я адчуваю, што наша справа неабыякавая для дзяржавы. Але я думаю, што настануць часы, калі дзяржава зверне на гэта ўвагу ўсур'ёз.

Мне шкада, што скульптура становіцца крыху спажывецкай... Але я хачу адзначыць, што ідзе пошук, цудоўны фармальны эксперыментальны пошук. І некалі наша скульптура вырвецца наперад, атрымаўшы гэты зарад, і стане зусім іншай... Я радуюся гіганцкай шматстайнасці, чароўнай палітры беларускай скульптуры — тое, што знаходзяць маладыя ў сваіх душах, як яны працуюць з гэтым упартым матэрыялам... Мяне захапляюць нашы дзяўчаты, якія становяцца побач — будучыя цудоўныя майстры. А гэта ж мужчынская прафесія...

Самаіронія, падладжванне пад сусветны культурны кантэкст уласцівыя асабліва творам маладых аўтараў. Вось, напрыклад, мінімалістычная кампазіцыя «Лесвіца ў неба» Ігара Засімовіча. У скульптуры заўжды найбольш хвалюе пытанне: **ЯК гэта зроблена?** І з гэтага пункту гледжання на выставе «Узбагачаючыся адно ад аднаго» ёсць на што паглядзець. Дзіва, што адзін майстар — Анатоль Арцімовіч — выхаваў такіх розных творцаў. Яны не толькі шукаюць свой шлях, сваю мастацкую мову, але і матэрыял. Скульптуры зроблены з дрэва, бронзы, мармуру, каменю, шкла, сілуміну, зварнога металу і г. д.

— У Віцебску, акрамя мяне, ёсць яшчэ скульптары, якія вучыліся ў Анатоля Яфімавіча, — **распавядае скульптар Валеры Магучы**, які займаўся ў Арцімовіча ў канцы 1980-х. — Дарэчы, і ягоныя скульптуры таксама стаяць у Віцебску. Сярод апошніх — помнік Гараўцу. Самае галоўнае, што Анатоль Яфімавіч вучыў не проста рамяству, а вучыў думаць, мысліць, разважаць, па-філасофску глядзець на ўсё; глядзець на кампазіцыю з абсалютна нечаканага пункту погляду, не так, як мы, студэнты, бачылі...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**



**«Дзіцячыя цацкі» Паўла Вайніцкага, відаць, адна з самых фрывольных кампазіцый выставы. Рознакаляровыя стракатыя шкляныя галовы нейкіх «чорцікаў» з чорнымі рожкамі нагадваюць крэатыўныя хрусткія цацкі для прасунутых дарослых, якія ў душы засталіся дзецьмі. Такая кампазіцыя добра пасуе для неардынарнага аздаблення інтэр'еру.**



**Павел Вайніцкі «Дзіцячыя цацкі».**



**Вольга Нячай «Perpetuum mobile».**



**Скульптура Вольгі Нячай «Perpetuum mobile» мае, па сутнасці, форму кола. Кола — вечная фігура без пачатку і канца, якое ў працы маладой мастачкі атаясамліваецца з вечным рухавіком. Кола сабе коціцца, а беднаму коніку, які апынуўся ўнутры, наканавана бегчы вечна...**



**Скульптар з Віцебска Валеры Магучы скарыстаў у сваёй працы вядомы апакрыфічны сюжэт «Сусана і старцы». Хараство твора ў яго форме: яна хавае ў сабе пэўную загадку. Змяняеш ракурс, і скульптура трансфармуецца на вачах, раскрываючы сэнс. Нахабныя пахатлівыя старцы шчыльна абхапілі цнатлівую Сусану, патрабуючы блізкасці. Што было далей — ведаем па кнігах. Скульптура спыняе імгненне.**



**Валеры Магучы «Сусана і старцы».**

*Разам*

# НАЛАДЗІМ «СТАЛОЎКУ» ДЛЯ КРЫЛАТЫХ!



**Угэтыя выхадныя грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» арганізоўвае акцыю «Птушкі на кармушцы».**

Спецыялісты АПБ разлічваюць вызначыць відавы склад зімовых птушак, што прылятаюць на кармушкі, прыцягнуць увагу людзей да праблем крылатых і, вядома, як след падкарміць нашых меншых сяброў. Звычайна арганізавана ў акцыі прымаюць удзел школьнікі і цэнтры пазашкольнай работы. Аднак дапамагчы птушкам зімой могуць усе добрыя людзі...

І цяпер не позна зрабіць невялікі адкрыты домік для дробных птушак або прыстасаваць пад сталоўку пластыкавыя бутэлькі вялікай ёмістасці.

Найбольш любімы і запатрабаваны корм для большасці птушак — насенне сланечніка, расказвае **спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН**. Масляністае насенне рапсу прыцягвае на кармушку зелянушак, вераб'ёў, гілёў, чыжоў, чачотак і шчыглоў. А вось проса не вельмі падабаецца маленькім насякомаедным, а хутчэй толькі зерняедным птушкам. Каб на кармушку прыляталі розныя віды птушак, трэба рабіць сумесь з 2 частак проса і рапсу, 1 часткі льнянога насення і прыкладна 3-4 частак насення сланечніка. Акрамя гэтай зернясумесі ў кармушку пажадана дабаўляць ягады рабіны і каліны, насенне лопуху, маку і лебяды. Сапраўдны далікатэс для птушак зімой — розныя ачышчаныя арэхі і насенне гарбузоў.

Многія птушкі даволі добра дзяўбуць і несалёнае сала. Даспадобы яно сініцам, попаўзням і дзятлам. Былі выпадкі, калі на кармушкі каля школ прылятаў нават зялёны дзяцел, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Дробна нарэзаныя кавалачкі сала на дне хаткі-кармушкі могуць стаць сапраўдным выратаваннем для адзінокіх шпакоў, якія часам застаюцца ў Беларусі на зімоўку.

Летась у студзені ў акцыі «Птушкі на кармушцы» прымала ўдзел больш за 400 чалавек. Адначасова вялася кампанія па зімовым уліку птушак Беларусі. Сёлета гэта кампанія арганізавана пры падтрымцы Міністэрства адукацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**



БЕЗ РЭЦЭПТА

## Добрай раніцы!



**Калі за акном цёмна і холадна, уставаць зранку асабліва цяжка. Ды яшчэ розныя балячкі пра сябе нагадваюць. Аднак калі навучыцца правільна прачынацца, то раніца сапраўды будзе добрай.**

**АКТЫВІЗУЕМ РАБОТУ ЎСІХ КЛЕТАК І ОРГАНАЎ**

Увесь комплекс практыкаванняў неабходна выконваць, не ўстаючы з ложка.

**1.** *Дзякуючы гэтаму практыкаванню вы разгоніце застаялую ў брушной поласці кроў, і клеткі «прачнуцца» хутчэй.* Лежачы на спіне, пакладзіце рукі на жывот і зрабіце некалькі глыбокіх удыхаў і выдыхаў: пры ўдыху напружвайце жывот і моцна выпінайце брушную сценку, пры выдыху максімальна ўцягвайце яе ў сябе. Зрабіце так 10 — 15 разоў. Тыя, каму складана выконваць практыкаванне з выцягнутымі нагамі, могуць іх крыху сагнуць у каленях.

**2.** *Пры дапамозе наступнага практыкавання вы прачысціце жоўцевыя шляхі.* Яно карыснае і тым, у каго праблемы з кішэчнікам. Перавярніцеся на левы бок і ляжце ў позу зародка, г. зн. максімальна падцягніце калені да падбародка. Пакладзіце правую руку на правае падрабрынне і ў такім стане зрабіце ад 5 да 15 удыхаў. Тое ж самае зрабіце, перавярнуўшыся на правы бок.

**РАСЦЯГВАЕМ ПАЗВАНОЧНІК**

**1.** Ляжце на жывот. Правую руку выцягніце ўперад, а правую пятку цягніце назад, затым тое ж самае паўтарыце з левага боку. Цяпер добра пацягніцеся дзвюма рукамі ўверх, а пяткамі — уніз.

**2.** Станьце на карачкі, спачатку выгніце спіну, а потым прагніце яе.

Пасля гэтага практыкавання не трэба адразу ўскокваць. Перад тым як устаць, пасядзіце крыху на ложку.

**КАЛІ ВЫ ГІПЕРТОНІК**

● Лежачы ў пасцелі прыміце лекі і нейкі час паляжыце, пакуль не адчуеце сябе камфортна.

● Для таго, каб з раніцы не было лішняй нагрузкі, усё неабходнае трэба прыгатаваць звечара. Ранішняя мітусня можа справакаваць пад'ём ціску.

**КАЛІ Ў ВАС ВАРЫКОЗ**

● Зранку зрабіце гімнастыку для ног (невялікія ўзніманні, «нажніцы»). Цяпер падыміце ногі і прысланіце іх да сцяны пад прамым вуглом да тулава. У такім стане трэба прабыць каля 10 хвілін і толькі пасля можна асцярожна нацягваць эластычныя панчохі ці бінтаваць ногі.

**КАЛІ ЁСЦЬ ПРАБЛЕМЫ СА СПІНАЙ**

● Зрабіце дыхальныя практыкаванні, але пасля іх уставайце вельмі акуратна. Спачатку апусціце ногі з пасцелі і крыху паляжыце так. Потым сядзьце і вельмі мякка зрабіце 5 — 10 нахілаў галавы ўперад — назад. Цяпер уставайце, крыху пастойце і пачынайце свой дзень.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫЯ

## Што любіць печань?

Калі вы іншы раз адчуваеце горыч у роце, боль у правым падрабрынні, вам неабходна быць крайне ўважлівымі да сваёй печані. Яна вельмі капрызная і хоча, каб вы абыходзіліся з ёю ветліва, на «Вы». Праверце сябе, ці ведаеце вы, што любіць ваша печань.

У першую чаргу гэта розная агароднiна: морква, капуста (лепш белакачанная і кваціста), буракі, памідоры, агуркі, кабачкі, гарбузы, пятрушка, кроп. З бялковых прадуктаў аддавайце перавагу нятлустай рыбе (фарэль, траска, карп), з мяса — цяляціне ці індычаціне. Карысныя сыр, кефір, ёгурт, свежае малако, тварог, яйкі ўсмятку. Самы каштоўны прадукт для печані — мёд. Есці яго трэба, калі ў вас няма алергіі, па 1 ч. лыжцы два разы на дзень. Любіць печань, калі вы займаецеся спортам. Гэта своеасаблівы масаж для печані. Заварвайце зёлкі: святаяннік, бяссмертнік, перцавую мяту, календулу, лакрычны корань, кветкі і карані дзьмухаўцу (па 1 ст. лыжцы кожнай расліны на 1 л кіпеню), настойвайце на працягу ночы.

Майце на ўвазе, што «не любіць» печань усё марынаванае, вэнджанае, вострае, тлустае.

**-2716-**

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

## Абутак: наша бяда — соль і вада

**Суровае выпрабаванне вытрымлівае наш абутак зімой, калі тратуары і дарогі пакрываюцца снежна-салявым месівам. Як засцерагчы яго ад прамакання і згубнага ўздзеяння солі?**

Пры вырабе абутку на яго паверхню наносіцца спецыяльны ахоўны лак. Аднак трымаецца ён у экстрэмальных умовах гарадской зімы ўсяго каля двух-трох тыдняў. Затым абутак пачынае прапускаць вільгаць, і калі яго не даглядаць, то праслужыць ён нядоўга.

Спачатку ачысціце абутак ад бруду, а калі на ім ёсць сляды солі, адмыйце яе цёплай вадой з мылам і прасушыце пры пакаёвай тэмпературы, унутр напхайце паперы. Затым на сухую паверхню чаравікаў ці ботаў нанясіце які-небудзь тлушчавы састаў. Лепш за ўсё выкарыстоўваць спецыяльныя сродкі з сіліконам, але можна абысціся і звычайным крэмам для рук. Далей абутак яшчэ раз прасушыце на працягу 30 хвілін і толькі пасля гэтага змажце яго тонкім слоем ваксы. Пачакайце яшчэ хвілін 20, пакуль вакса высахне, і старанна адпаліруйце. Зранку, перад тым, як выйсці на вуліцу, абутак трэба дадаткова пачысціць сродкам з сіліконам.



*Памятайце: самая высокая канцэнтрацыя рэагентаў на абочынах дарог, таму больш за ўсё «пакутуе» абутак аўтаматараў, якія, выходзячы з машыны, адразу ступаюць на абочыну ці край тратуара.*

ЖАНОЧЫЯ ХІТРАСЦІ

## Фарбуем, але не псуем

**Змяніць колер валасоў і пры гэтым не нашкодзіць ім дапамогуць прыродныя фарбавальнікі.**

**КВЕТКІ ЛІПЫ**

***Для якіх валасоў:*** русых, цёмна-русых і светла-каштанавых.

***Адценне:*** ад каштанавага да карычневага.

**Рэцэпт:** 5 ст. лыжак кветак ліпы заліце 1,5 шк. вады, пастаўце на невялікі агонь і, памешваючы, выпарце прыкладна 100 мл вады. Адвар астудзіце, працадзіце, нанясіце на вымытыя валасы і трымайце 30 — 60 хвілін. Затым апаласніце іх цёплай вадой.

**ЧОРНЫ ЧАЙ**

***Для якіх валасоў:*** амаль для ўсіх, акрамя цёмна-каштанавых і чорных.

***Адценне:*** ад саламяна-жоўтых да каштанавых.

**Рэцэпты:** 1. Заварыце моцны чай і апалосквайце ім сівыя валасы пасля кожнага мыцця. Яны стануць саламяна-жоўтымі.

2. 2 ст. лыжкі сухой заваркі заліце 2 шк. кіпеню, настойвайце 20 хвілін, працадзіце. Цёплы настой нанясіце на валасы, надзеньце шапачку для душа і абкруціце галаву ручніком. Трымайце 20 — 40 хвілін. Праз тры-чатыры працэдуры валасы набудуць каштанавае адценне.

**ХНА І БАСМА**

***Для якіх валасоў:*** любых.

***Адценне:*** ад рыжага да чорнага.

| *Фарбавальнікі* | *Колер* |
|---|---|
| хна+рамонак (1:1) | ярка залацістыя |
| хна | чырвона-рыжы |
| хна+басма (2:1) | бронзавы |
| хна+басма (1:1) | каштанавы |
| хна+басма (1:2) | чорны |

**Рэцэпт:** 2 ст. лыжкі любой сумесі разбаўце ў шклянцы гарачай вады. Крыху астудзіце і нанясіце на валасы. Трымайце 40 — 90 хвілін — у залежнасці ад яркасці жаданага адцення.

**РАМОНАК**

***Для якіх валасоў:*** светла-русых і русых.

***Адценне:*** залацістае.

**Рэцэпт:** 150 г суквеццяў рамонку заліце 0,5 л кіпеню, настойвайце 1,5 — 2 гадзіны. Працадзіце, дадайце да настою 60 г гліцэрыны. Памыйце валасы шампунем, затым апаласніце іх рамонкавым настоем, праз 30 хвілін змыйце гарачай вадой. Прымяняйце раз на тыдзень.

**-2717-**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**КОНКУРС РАШЭННЯЎ**

**Заданне № 11**



**Белыя:** Крg7, Фg1, п. а 7 (3).

**Чорныя:** Кре8, Ла8, Лb7, Сc7, се2, пп. b2, d6, d7, е6, е7, g6 (11).

Мат за 5 хадоў.

**Заданне № 12**



**Белыя:** Крh6, Се4, пп. g5, h5 (4).

**Чорныя:** Крh8, Са2 (2).

Ход чорных.

Чакаем вашых адказаў.

**СА СТАРЫХ ПАРТЫЙ**

Цікава пазнаёміцца з міні-партыямі і партыямі, у якіх дрэнна разыграны дэбют, як правіла, цягне за сабой вялікія цяжкасці ў сярэдзіне партыі, а далей і таго горш.

Вось адзін з рэкордаў кароткасці шахматнай творчасці. Мінгрэліён — Дураў (Кіеў, 1896 г.) 1. е4 d6 2. Сс4 Kd7 3. Kf3 g6 4. Kg5 Kh6? 5. С:f7+ К:f7 6. Ке6. Чорныя здаліся.

Але здаўна вядома, што сапраўдным творам можа быць нават вельмі кароткая партыя. Для прыкладу разгледзім партыю Шпільман — Флямберг (Мангейм, 1914 г.) 1. е4 е5 2. Кс3 Kf6 3. f4 d5 4. fe К:е4 5. Kf3 Cg4 6. Фе2 Кс5 7. d4! С:f3 8. Ф:f3 Фh4+ 9. g3 Ф:d4 10. Се3 Ф:е5 11. о-о-о с6 12. К:d5 cd 13. Л:d5 Фе6 14. Сс4 Фе4 15. С:с5! Чорныя здаліся.

Характэрны і наступны выдатны ўзор шахматнай творчасці Рэджыа — Тараш (Монтэ-Карла, 1902 г.) 1. е4 с5 2. Кс3 Кс6 3. Kf3 е6 4. d4 cd 5. К:d4 Kf6 6. Kdb5 Cb4 7. Cf4 К:е4 8. Кс7+ Крf8 9. К:а8? Фf6 10. Фf3 К:с3 11. Cd2 Kd4! 12. Фd3 Фе5+ 13. Се3 Ка4+ 14. с3 К:b2! Белыя здаліся.

А гэта партыя ўзята з міжнароднага турніру ў Марыенбадзе 1927 г. Яноўскі — Земіш.

1. d4 Kf6 2. Kf3 е6 3. Cg5 с5 4. е3 Кс6 5. Kbd2 b6 6. с3 Cb7 7. Cd3 cd 8. ed Се7 9. Кс4 о-о 10. Фе2 Фс7 11. h4 h6 12. Фd2 Kg4 13. Cf4 d6 14. Ке3 К:е3 15. Ф:е3 h5 16. Лh3 е5? 17. de К:е5 18. К:е5 de 19. С:е5 Cd6 20. Фh6! Чорныя здаліся.

І нарэшце, яшчэ адзін прыклад, дзе дрэнна разыграны дэбют. Г. Каспараў — С. Бягун (Мінск, 1977 г.) 1. d4 d5 2. с4 е6 3. Кс3 Kf6 4. Kf3 с5 5. cd К:d5 6. е3 Кс6 7. Cd3 Се7 8. о-о о-о 9. К:d5 Ф:d5 10. е4 Фd8 11. dc С:с5? 12. е5! Се7 13. Фе2 Kb4 14. Cb1 Cd7 15. а3 Kd5 16. Фе4 g6 17. Ch6 Ле8 18. h4 Фb6 19. h5 f5 20. ef К:f6 21 Фе1! К:h5 22. Ке5 Cb5 23. С:g6 Kf6 24. С:h7+ і чорныя здаліся.

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**

**извещает о проведении <u>26 января 2011 года</u> повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Характеристика | Начальная цена продажи, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Воздушное судно НАРП-1 | Сельскохозяйственный, однодвигательный, поршневой двухместный моноплан. Изготовлен 01.09.2004, назначенный ресурс самолета 4 000 часов, 10 000 посадок, 15 лет. Ремонтов не имел. Двигатель Rotax -912, назначенный ресурс 3 600 часов, 45 лет. | 36 672 000 | 3 000 000 |

**<u>Продавец:</u>** <u>Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС».</u> **Имущество расположено по адресу:** 247050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 25. **<u>Шаг аукциона – 5 %.</u>** Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 24 января 2011 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС»): р/с 3012200630018, в Гомельском областном упр. ОАО «Бел.АПБ» УНП 400010620 ОКПО 05884280. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 199 от 12.10.10. **Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**



**Усходні гараскоп на наступны тыдзень**

# Ільвам спатрэбіцца рашучасць, а Блізняты могуць адкрыць у сабе новыя таленты

**АВЕН.** Надыходзіць досыць складаны і адказны перыяд, якому можа спадарожнічаць некаторае ўнутранае напружанне. Для дасягнення поспеху ў працы спатрэбіцца сіла волі, засяроджанасць і душэўная раўнавага, але дзякуючы аптымізму ўсё задуманае здзейсніцца. Паспрабуйце больш-менш адэкватна ўспрымаць тое, што адбываецца ў навакольным свеце і не ісці на повадзе ўласных ілюзій. Зносіны з сябрамі падораць нямала прыемных хвілін і масу цікавай і карыснай інфармацыі.

**ЦЯЛЕЦ.** Давядзецца разбірацца з назапашанымі неадкладнымі справамі. На аўторак не варта планаваць сур'ёзныя дзелавыя сустрэчы, бо вам могуць перашкодзіць неспрыяльныя акалічнасці. Рашэнне спрэчнага пытання, якое ўзнікне ў сераду, варта адкласці да наступнага тыдня. Не спадзявайцеся на парады сяброў, яны могуць збіць вас з панталыку. У пятніцу падчас дзелавых перамоў прадэманструйце партнёрам новы падыход да спраў — тады вашы адносіны стабілізуюцца. Суботу прысвяціце зносінам з бацькамі або старэйшымі сваякамі, у іх для вас ёсць слушная рада.

**БЛІЗНЯТЫ.** Можаце адкрыць у сабе невядомыя раней грані і таленты. Прафесійнае жыццё ажывіцца, і многія людзі з найбліжэйшага асяроддзя падтрымаюць вашы пачынанні. У сераду варта асцерагацца прыяцеляў, асабліва тых, хто любіць пабалбатаць. У другой палове тыдня вы можаце раптам змяніць стыль сваіх паводзін. У чацвер варта вылучыць час для пабудовы планаў на бліжэйшы месяц. У выхадныя ў якасці адпачынку пажадана паездка на прыроду ў невялікай кампаніі.

**РАК.** Першыя два дні тыдня спрыяльныя для далёкіх паездак, вандраванняў — як дзелавых, так і забаўляльных і пазнавальных. У чацвер паспрабуйце пазбягаць цеснага кантакту з начальствам, афіцыйнымі асобамі, людзьмі старэйшага ўзросту і наогул з любымі структурамі ўлады, як дзяржаўнай, так і вашай уласнай — хатняй. У гэты дзень вам могуць быць прад'яўлены прэтэнзіі з нагоды мінулых правінасцяў і абавязкаў, якія лічацца за вамі. Пятніцу паспрабуйце выкарыстаць для выпраўлення сваіх памылак, асабліва ў стаўленні да калегаў. У суботу ўвечар вам спатрэбіцца досыць шмат вольнага часу, каб вырашыць праблему, якая раптам узнікла.

**ЛЕЎ.** Давядзецца шмат часу прысвяціць рашэнню асабістых праблем. Чацвер і пятніца могуць быць напоўнены мітуснёй, разнастайныя падзеі будуць змяняцца як у калейдаскопе. Вам спатрэбіцца рашучасць і хуткасць рэакцыі. Імкніцеся не шукаць неадкладных змен, прыслухайцеся да голасу інтуіцыі. Перш чым штосьці сказаць, спачатку добра падумайце. Калі вы ў эмацыйным парыве не нагаворыце лішняга, то ў вас можа з'явіцца добры шанц для службовага росту. Начальства можа падтрымаць новыя ідэі.

**ДЗЕВА.** Тыдзень варта прысвяціць пабудове планаў на будучыню. Варта задумацца аб тым, што вас чакае, і своечасова падрыхтавацца да будучых падзей. Не дазваляйце блізкім людзям і сваякам перагружаць вас сваімі праблемамі. Цікавым днём будзе серада — пры ўдалым збегу абставін вы нават з непрыемнасцяў зможаце атрымаць для сябе карысць. У пятніцу не саромейцеся дамагацца свайго ў спрэчцы з калегамі і начальствам. Выхадныя варта правесці ў зносінах са старымі сябрамі. У нядзелю не спрабуйце пачынаць новыя справы.

**ШАЛІ.** Тыдзень спрыяльны для творчасці — асабліва важныя гэты прагноз для людзей мастацтва. Аднак будзьце гатовыя да таго, што ваша жыццё стане прадметам пільнай увагі з боку калег. У аўторак, максімальна выкарыстоўваючы сваё абаянне, вы можаце дамагчыся практычна любых мэт. Вашы смелыя рашэнні могуць прывесці ў захапленне тых, з кім вы працуеце, але ўвасабляць гэтыя ідэі давядзецца самастойна. У канцы тыдня магчыма вяртанне старых сувязяў і з'яўленне новых знаёмстваў.

**СКАРПІЁН.** Першая палова тыдня будзе больш удалая, чым другая. Вам неабходна разабрацца ў сваім эмацыйным стане і навучыцца кантраляваць эмоцыі. Калі не будзеце ўпадаць у крайнасці, перад вамі адкрыюцца доўгачаканыя прафесійныя і творчыя далягляды. Гэты шлях больш плённы і перспектыўны, чым проста плыць па плыні. Усё таемнае можа стаць відавочным. Падрыхтуйцеся да гэтага — прывядзіце ўсе дакументы ў парадак. Выхадныя пажадана правесці дома, не плануючы нічога глабальнага.

**СТРАЛЕЦ.** Прыслухайцеся да сваёй інтуіцыі, і тады вы зможаце прыняць рашэнні, якія забяспечаць поспех. На працы верагодныя змены да лепшага. Праявіце камунікабельнасць, нават калі вельмі не хочацца, — і вы не пашкадуеце аб гэтым. Неабходна ўвесь час быць у курсе падзей, каб не прапусціць нейкую важную інфармацыю. У выхадныя паспрабуйце адхіліць усе свае клопаты і павесяліцеся ад душы з сябрамі.

**КАЗЯРОГ.** Справы могуць пайсці не зусім так, як вы чакалі, далягляды апынуцца даволі імглістыя. Калі не ўпэўнены ў сваіх дзеяннях, лепш не спяшацца — такая прадбачлівасць дазволіць пазбегнуць многіх праблем у далейшым. Не эканомце час на сне, каб да іншых фактараў не дадалася яшчэ і няўважлівасць ад стомленасці. Плануючы будучыню, пакіньце ў рэзерве некалькі варыянтаў, каб раптоўныя змены не заспелі вас знянацку. Аўторак і серада выдатна падыходзяць для здзяйснення подзвігу. Варта як мага больш асцярожна ставіцца да прапаноў акружаючых: цяпер вялікая рызыка падпадаць на правакацыю. У пятніцу скарацце да мінімуму зносіны з суседзямі і сваякамі.

**ВАДАЛЕЙ.** На працы справы ідуць удала. Магчымыя далёкія паездкі, замежныя камандзіроўкі, падпісанне новых дамоў. Дзелавыя партнёры не падвядуць вас у рэалізацыі планаў. Калі спатрэбіцца дапамога, можаце разлічваць на сяброў. Засцеражыце сябе ад непатрэбных сустрэч, бо яны могуць адмоўна адбіцца на вашай энергетыцы. Найбольш спрыяльным днём будзе панядзелак, няўдалай можа апынуцца субота.

**РЫБЫ.** Варта арыентавацца на ўласныя сілы і магчымасці, а дэвізам узяць такое выказванне: «Жадаеш, каб атрымалася добра, — зрабі сам». У панядзелак магчымыя паездкі, якія звязаны з новымі справамі. У чацвер блізкія людзі могуць адмовіцца беспярэчна падпарадкоўвацца, таму варта назапасіць важкія аргументы і ўгаворваць, а не загадваць. У пятніцу нейкая прыемная навіна зменіць вашы планы — зразумела, да лепшага. У выхадныя дні спрыяльна заняцца добраўпарадкаваннем дома, папярэдне выкінуўшы з яго непатрэбны хлам.

# БЕЛАРУСБАНК

## ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

**выигрышей 2-го тиража по срочным банковским вкладам в белорусских рублях «Шанс», проведенного 12.01.2011 г. в ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32.**

Выигрыши выпали на следующие номера лицевых счетов срочных банковских вкладов в белорусских рублях «Шанс»:

| № п/п | Номер лицевого счета | Номер филиала, ЦБУ и отделения ОАО «АСБ Беларусбанк» | | | Наименование выигрыша |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 112000004 | 302 | | 126 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 2 | 112000001 | 500 | | 306 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 3 | 112000002 | 121 | | 063 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 4 | 112000002 | 802 | | 031 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 5 | 112000008 | 121 | 119 | 097 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 6 | 112000002 | 323 | | 073 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 7 | 112000003 | 503 | | 157 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 8 | 112000001 | 718 | | 089 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 9 | 112000012 | 503 | | 208 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 10 | 112000005 | 317 | | 317 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 11 | 112000005 | 300 | | 119 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 12 | 112000001 | 200 | 218 | 165 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 13 | 112000004 | 511 | | 045 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 14 | 112000001 | 712 | | 034 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 15 | 112000009 | 121 | 112 | 136 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 16 | 112000006 | 300 | | 105 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 17 | 112000001 | 616 | | 008 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 18 | 112000007 | 300 | | 060 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 19 | 112000001 | 601 | | 017 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 20 | 112000001 | 510 | | 010 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 21 | 112000010 | 606 | | 606 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 22 | 112000011 | 601 | | 601 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 23 | 112000012 | 200 | | 103 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 24 | 112000007 | 510 | | 257 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 25 | 112000008 | 200 | | 103 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 26 | 112000004 | 300 | | 002 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 27 | 112000008 | 503 | | 208 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 28 | 112000006 | 511 | | 198 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 29 | 112000002 | 514 | | 374 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 30 | 112000004 | 616 | 621 | 029 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 31 | 112000002 | 200 | | 013 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 32 | 112000004 | 529 | | 078 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 33 | 112000002 | 633 | | 009 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 34 | 112000001 | 503 | | 197 | Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт» |
| 35 | 112000003 | 111 | | 111 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 36 | 112000010 | 500 | | 295 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 37 | 112000003 | 201 | | 126 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 38 | 112000006 | 633 | | 633 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 39 | 112000001 | 113 | | 027 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 40 | 112000020 | 121 | 112 | 136 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 41 | 112000007 | 802 | | 802 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 42 | 112000001 | 121 | 119 | 103 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 43 | 112000002 | 514 | | 113 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 44 | 112000003 | 400 | 415 | 415 | Стиральная машина производства ЗАО «Атлант» |
| 45 | 112000002 | 302 | | 302 | Холодильник производства ЗАО «Атлант» |
| 46 | 112000001 | 503 | | 503 | Холодильник производства ЗАО «Атлант» |
| 47 | 112000021 | 121 | 112 | 136 | Холодильник производства ЗАО «Атлант» |
| 48 | 112000001 | 322 | 319 | 319 | Холодильник производства ЗАО «Атлант» |
| 49 | 112000002 | 121 | | 038 | Телевизор производства ОАО «Горизонт» |
| 50 | 112000005 | 113 | 106 | 106 | Телевизор производства ОАО «Горизонт» |

| | | |
|---|---|---|
| **Председатель комиссии:** | **директор департамента ревизий ОАО «АСБ Беларусбанк»** | **В.В. Крук** |
| **Ответственный секретарь:** | **главный специалист департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»** | **Н.В. Корбут** |

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2010 г., млн. бел. руб.**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2010 год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 7,8 | 73,8 | 236,0 | 326,8 | 207,9 | 839,0 | 319,6 | 428,0 | 515,2 | 370,8 | 1886,7 | 60072,8 | 65284,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 7,6 | 73,0 | 234,6 | 325,0 | 205,1 | 835,9 | 318,1 | 425,3 | 512,9 | 367,1 | 1880,2 | 60015,0 | 65199,8 |
| в иностранной валюте | 0,2 | 0,8 | 1,4 | 1,8 | 2,8 | 3,1 | 1,5 | 2,7 | 2,3 | 3,7 | 6,5 | 57,8 | 84,6 |
| Срочные депозиты | 93342,6 | 104496,0 | 130293,5 | 118149,6 | 112007,0 | 114286,8 | 99323,4 | 115963,9 | 102920,3 | 84705,4 | 102572,5 | 94096,7 | 1272157,7 |
| в том числе: в белорусских рублях | 62894,2 | 74091,3 | 94123,7 | 83865,7 | 79269,4 | 79773,7 | 67225,8 | 83239,0 | 71583,8 | 56764,0 | 71578,3 | 59208,4 | 883617,3 |
| в иностранной валюте | 30448,4 | 30404,7 | 36169,8 | 34283,9 | 32737,6 | 34513,1 | 32097,6 | 32724,9 | 31336,5 | 27941,4 | 30994,2 | 34888,3 | 388540,4 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*


## КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г. Дзяржынск



**Па гарызанталі: 4.** Насякомае, якое, паводле беларускай міфалогіі, утварылася са слёз дзяўчыны-прыгажуні. **6.** Рыба з сямейства ласосяў. **9.** Адзін з самых распаўсюджаных мінералаў у зямной кары. **10.** Страва са свежай рыбы з прыправай. **11.** Самая буйная парода сабак. **15.** Невялікі кусцік жыта, каля якога спраўляюць дажынкі. **16.** ...- сапсан. На Беларусі самая хуткая птушка. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. **17.** Персанаж усходнеславянскай міфалогіі, звязаны са святкаваннем Новага года. **20.** ...або Пан. У беларускай міфалогіі галоўны чорт, які з'яўляецца чалавеку ў марозную месячную ноч, і знікае са спевамі пеўняў. **21.** Самая дробная істота на Зямлі, якая не належыць ні раслінаму, ні жывёльнаму свету. **24.** У антычнай міфалогіі марское бажаство ў выглядзе напалову чалавека, напалову рыбы. **25.** Вялікая змяя, якая абыходзіцца без ежы некалькі месяцаў. **27.** Паводле беларускай міфалогіі — вадзянік, жыхар стаячай вады. **31.** Не чутныя чалавеку пруткія хвалі, якімі карыстаюцца лятучыя мышы, кіты, многія птушкі, рыбы. **33.** Тое, што і вохра. **34.** ... і Камала. Імёны дзяўчынак з Індыі, якіх некалькі гадоў «выхоўвала» ў сваім логаве ваўчыца. **35.** Буйная млекакормячая жывёліна, якая водзіцца ў Паўднёвай Азіі, на востраве Камода. **36.** Невялікая драпежная жывёліна, у якую, паводле павер'яў, ператвараюцца малочныя ведзьмы і якая па начах заплятае ў коней грывы.

**Па вертыкалі: 1.** Адна з назваў казачнага злоснага вядуна — варажбіта. **2.** Прафесія, якую неаднойчы выконваў дэльфін, праводзячы судны. **3.** Невялікая жывёліна, чэмпіён сярод жывёльнага свету па галаданні: можа абыходзіцца без ежы 7 гадоў. **5.** Чарадзейства. **7.** Паўднёвы ядомы плод — чэмпіён у раслінным свеце па колькасці вітамінаў. **8.** Насякомае, чэмпіён свету па пражэрлівасці: некаторыя асобіны паядаюць самі сябе. **12.** Жаласны стогн. **13.** Так называлі ў старажытнасці насарога, якога, згодна міфу, Ной не ўзяў у свой каўчэг. **14.** Краіна ў Паўднёвым паўшар'і, дзе існуе адзіны ў свеце помнік молі. **18.** Адна з самых марозаўстойлівых птушак: вытрымлівае маразы да мінус 110 градусаў. **19.** Драпежная членістаногая жывёліна, якая пераварвае ежу па-за сабой. **22.** Марскі ... Так называюць васьмінога за яго здольнасць «страляць» у сваю здабычу атрутнай вадкасцю. **23.** Карзіна для пасажыраў паветранага шара. **26.** Вымерлы дзікі бык. **28.** Музычны твор у хуткім тэмпе. **29.** Балотная птушка, якая зімуе ў Афрыцы. **30.** Майскі жук ці ...: у 15-м стагоддзі швейцарскі суд прыгаварыў яго да выгнання. **32.** Пачвара з некалькімі галовамі: персанаж беларускай міфалогіі.

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ:**

**Па гарызанталі:** 4. Пчала. 6. Омуль. 9. Кварц. 10. Юшка. 11. Сенбернар. 15. Барада. 16. Сокал. 17. Аўсень. 20. Паніч. 21. Вірус. 24. Трытон. 25. Пітон. 27. Ціхоня. 31. Ультрагук. 33. Охра. 34. Амала. 35. Яшчар. 36. Ласка. **Па вертыкалі:** 1. Касцей. 2. Лоцман. 3. Клешч. 5. Чары. 7. Авакада. 8. Саранча. 12. Енк. 13. Адзінарог. 14. Аўстралія. 18. Качка. 19. Павук. 22. «Стралок». 23. Гандола. 26. Тур. 28. Алегра. 29. Дупель. 30. Хрушч. 32. Цмок.

## Усміхнемся!

**Зараз зразумела, чаму ў валейбалістак самыя паслухмяныя дзеці. Яны ўсё разумеюць з першага ўдару па карку.**

☺

— Ты чаго не голішся?

— Няма ў мяне дзяўчыны, для якой хацелася б пагаліцца...

— А для сябе?

— А для сябе я піва куплю.

☺

**У СССР пультам ад тэлевізара быў самы малодшы ў сям'і.**

☺

У турме:

— За што сядзіш?

— Ды двух зайцоў адным стрэлам прыстрэліў.

— Ты што, добры паляўнічы?

— Не, злы кантралёр.

☺

**Мужык сказаў. Мужык стукнуў па стале. Мужык з акна рэчы ловіць...**

☺

— Доктар, вартаўнік вашай клінікі Сямёныч — такі прывабны мужчына...

— Дык грошай няма. Зарплату выплачваем натурай — пластычнымі аперацыямі.





Віншуем з днём нараджэння дарагую жонку і бабулю **Сафію Міхайлаўну ЦІТОВУ** з пас. «Залог пяцігодкі» Пухавіцкага раёна. Самыя лепшыя словы падзякі табе, усе кветкі да тваіх ног, нізкі паклон за тое, што ты ў нас ёсць.

**Сям'я КЕБІЧ, г. Мінск.**



Віншуем з днём нараджэння **Еву Іванаўну ЕРМАКОВІЧ** з в. Тоцк Салігорскага раёна. Зычым чашу поўную здароўя, хай жыццё ёй прыняцце, і ўсмешка каб на твары кожны дзень у яе лунала.

**Сям'я ЕРМАКОВІЧ.**


### Зніклі буракі, морква і... дырэктар

Грамадзянін Украіны, ён жа дырэктар ААТ у Мінску, на давер загрузіў 20 тон буракоў і столькі ж морквы ў машыну і з'ехаў. Грошай у суме 37 мільёнаў фермер з в. Новая мыш (Баранавіцкі раён) не дачакаўся.

Махінатара шукае міліцыя.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.**

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:** І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

**НАШ АДРАС**: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

**http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by**

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ:**
**тэл./факс:** 287 17 79,
***e-mail:*** reklama@zvyazda.minsk.by.

**Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33 380. Індэкс 63850.**
**Зак. № 215. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**